У Гродне 1-я дарослая і 1-я дзіцячая паліклінікі сталі самастойнымі юрыдычнымі асобамі. Чым гэта выклікана і як такі крок мясцовых улад адаб'ецца на медыцынскім абслугоўванні гараджан? МС

Рызыка — іх спадарожнік, яны ніколі не развітваюцца, каб пасля не сустрэцца на пажары. Менавіта ў выратавальнікаў з пажарнай часці правялі адзін дзень карэспандэнты «Звязды». СТАР. 4

Журналісты шмат разоў «мянялі прафесію», каб на сваёй «скуры» адчуць нюансы працы, напрыклад, паштальёна, кандуктара і іншых спецыялістаў. Але каб ператварыцца ў чысцільшчыка абутку... СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 КРАСАВІКА 2013 г. СЕРАДА № 76 (27441) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СУПРАЦОЎНІЦТВА ДЗЕЛЯ МІРУ

Беларусь застаецца прыхільнай да супрацоўніцтва з Расіяй у сферы абароны. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 23 красавіка на сустрэчы з міністрам абароны Расіі Сяргеем Шайгу, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Фота БЕЛТА.

«Беларусы заўсёды будуць прыхільныя да той палітыкі, якую мы дэкларуем публічна. У нас няма палітыкі двайнога дна. Мы заўсёды будзем адзіныя ў дзеяннях, асабліва сістэм абароны і бяспекі, будзем дзейнічаць у адным ключы», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, супрацоўніцтва паміж ваеннымі ведамствамі Беларусі і Расіі ажыццяўляецца без якіх-небудзь праблем, і гэтыя адносіны з'яўляюцца ўзорам у Саюзнай дзяржаве.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што раней была дасягнута дамоўленасць аб тым, каб з удзелам адпаведных спецыялістаў з абодвух бакоў прарэвізаваць пытанні ўзаемаадносін у ваеннай сферы. «Мы ні ад каго не ўтойваем, што мы самыя блізкія народы і спрабуем выбудаваць адзіную палітыку ў агульнай Саюзнай дзяржаве. Калі ў нас ёсць на гэтым напрамку ў рамках АДКБ і Саюзнай дзяржавы адзіная групоўка ўзброеных сіл, значыць, мы яе павінны рыхтаваць адпаведным чынам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы ніколі не гаварылі аб тым, што ў нас нейкая наступальная пазіцыя нашых узброеных сіл. Зямлі ў нас хапае. Мы на чужое не прэтэндуем, але і свайго не аддадзім», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Калі мы рыхтуем нашы ўзброеныя сілы, сілы бяспекі да абароны нашых сумесных інтарэсаў, зямлі, то мы павінны праводзіць адпаведныя мерапрыемствы, у тым ліку вучэнні. Я не разумею, чаму Захад так насцярожана рэагуе на іх. Гэта ж не першыя вучэнні. Мы проста прыціраемся адзін да аднаго, з'явіліся новыя людзі, мы правяраем сістэму, якая даўно наладжана», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Яна ні ў якім выпадку не накіравана ні супраць палякаў, ні прыбалтаў, ні супраць НАТА наогул», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Але, вядома, яны павінны разумець, што, калі яны паспрабуюць неяк нядобра паглядзець у наш бок, мы будзем таксама рэагаваць», — заўважыў Прэзідэнт Беларусі

У сваю чаргу Сяргей Шайгу паведаміў, што бакі актыўна рыхтуюцца да маючага адбыцца стратэгічнага вучэння «Захад-2013». Паводле яго слоў, гэта мерапрыемства дасць магчымасць яшчэ раз праверыць гатоўнасць да рэагавання на сучасныя выклікі і выявіць тое, што яшчэ неабходна зрабіць дадаткова для забеспячэння бяспекі Беларусі і Расіі.

Міністр таксама расказаў аб некаторых перспектыўных напрамках развіцця беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы. «Мы пачынаем разгляд плана па стварэнні тут расійскай авіяцыйнай базы з самалётамі-знішчальнікамі. Спадзяёмся, што ў 2015 годзе тут ужо з'явіцца авіяцыйны полк», — заявіў ён. Паводле слоў Сяргея Шайгу, у 2013 годзе плануецца стварыць у Беларусі авіяцыйную камендатуру і паставіць першае дзяжурнае звяно баявых знішчальнікаў.

Акрамя таго, у 2014 годзе Расія паставіць у Беларусь яшчэ 4 дывізіёны С-300 для абароны паветранай прасторы. Сяргей Шайгу нагадаў, што Беларусь і Расія рэалізуюць сумесную праграму стварэння рэгіянальнай сістэмы проціпаветранай абароны, якая, паводле яго слоў, павінна быць надзейнай і грунтоўнай, абараняць паветраную прастору і граніцы Саюзнай дзяржавы. Акрамя таго, рэалізуецца вялікая праграма ў сферы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва.

«Мы плануем і ў далейшым разглядаць пытанні, неабходныя для ўзмацнення абараназдольнасці нашых беларускіх калег і братоў».

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Ёсць пытанне? Тэлефануйце!

Сёння, **24 красавіка,** Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама правядзе прамую тэлефонную лінію на тэму **«Парадак і ўмовы прызначэння дапамогі па доглядзе інваліда 1 групы альбо асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту»**.

Свае пытанні вы можаце задаць **з 11.00 да 13.00** па тэлефонах: **223 44 34, 223 59 53.**

СМІ Ў БЕЛАРУСІ: МАЙСТЭРСТВА КІРАВАННЯ ХУТКАСЦЮ

Учора адкрылася выстава адначасова традыцыйная і незвычайная. У другі раз на адной пляцоўцы, якой сёння стаў Футбольны манеж у Мінску, аб'ядналіся XX Міжнародны форум па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «TIBO-2013» і XVII Міжнародная спецыяльная выстава «СМІ ў Беларусі». Атрымалася не толькі шматлюдна, цікава і відовішна, але і сімвалічна. Больш за тое — з моцным энергетычным зарадам. Бо ў адной вялікай зале можна ўбачыць дзень сённяшні і дзень заўтрашні беларускай медыясферы, а таксама эканомікі, медыцыны, адукацыі, навукі, сувязі і нават індустрыі забаў. Але самае галоўнае — упэўніцца, як усё гэта ўзаемазвязана.

Неабходныя прыпынкі

Тое, што спалучэнне сродкаў масавай інфармацыі і ІТ-тэхналогій — не выпадковае, заўважыў і **Аляксандр РАДЗЬКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі,** які ўдзельнічаў у адкрыцці выставы.

— Прэзідэнт у Пасланні беларускаму народу і парламенту казаў пра фактары, якія вызначаюць сучаснае жыццё, і на першае месца паставіў хуткасць, — сказаў ён. — Мяркуючы па ўсім, хуткасць перадачы, апрацоўкі, прыёму інфармацыі — самыя галоўныя тэмы сучаснасці. Мы ўдзельнічаем у гэтых хуткасных працэсах на ўзроўні стварэння тэхнікі і адпаведнага праграмнага забеспячэння. Пры гэтым вельмі важна ведаць, што робіцца ў свеце — таму і задумана выстава. Тут вельмі шмат моладзі, ёй блізкая гэта дынаміка, цікавыя гэтыя тэхналогіі. Я ўпэўнены, што выстава і на гэты раз будзе мець каласальны поспех. Яна пацвярджае, што наша краіна развіваецца з той жа хуткасцю, што і ўвесь свет.

Доказам таму — рух беларускай прэсы ў бок электронных версій, аб'яднанне некалькіх рэдакцый у выдавецкія дамы, стварэнне інтэрнэт-партала беларускіх СМІ, які будзе прэзентаваны ў рамках выставы.

Аднак вялікія хуткасці тояць небяспеку. У выпадку сродкаў масавай інфармацыі гэта, перш за ўсё, верагоднасць памылкі, немагчымасці асэнсаваць навіну. І вось тут пэўны баланс павінны забяспечыць папяровыя носьбіты інфармацыі — традыцыйныя газеты і часопісы, якія дазваляюць зрабіць неабходны прыпынак, каб падумаць, прааналізаваць падзею або тэндэнцыю, каб атрыманая інфармацыя была на карысць развіццю асобы і грамадства.

— Хуткасць будзе ўзрастаць, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў, — але за ёй трэба сачыць, бо на вялікай хуткасці можа і занесці. Нават пры вялікай хуткасці вельмі патрэбны прыпынкі. Каб заправіцца, адпачыць, зрабіць перазагрузку. Таму, развіваючы хуткасныя інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт і тое, што яму спадарожнічае, трэба мець газету, часопіс. Часам трэба падумаць павольна, грунтоўна. Гэта спалучэнне якраз дапамагае ўраўнаважыць працэсы, збалансаваць іх.

Дзеля ўдасканалення майстэрства кіравання хуткаснымі працэсамі ў інфармацыйным полі кіраўніцтва краіны ўзяло курс і на аб'яднанне рэдакцый нацыянальных газет.

— Больш правільна такія аб'яднанні назваць «выдавецкі дом», бо зараз трэба ў інфармацыйным полі пазбегнуць дублявання, каб СМІ больш мэтанакіравана маглі даводзіць інфармацыю да спажыўца, і, безумоўна, трэба, каб гэта кіравалася з аднаго цэнтра, — патлумачыў Аляксандр Радзькоў журналістам. — Усе газеты застануцца са сваімі брэндамі, са сваімі падпісчыкамі, але інфармацыйная ідэалогія будзе ўзгоднена, і гэта правільна. Каб правільна размеркаваць сродкі, вызначыць структурную палітыку і данесці яе да кожнага спажыўца, трэба аб'ядноўвацца.

Перайманне лепшага

Пра хуткасць як галоўны крытэрый поспеху казаў на выставе і старшыня яе арганізацыйнага камітэта, **намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль КАЛІНІН:**

— Гэтая выстава ўнікальная тым, што яна значна большая па маштабах, мы бачым вялікі інтарэс да нас замежных гасцей, партнёраў і калег. І самае галоўнае — выстава адрасавана моладзі, яна — пра будучыню нашай эканомікі. Ніводная сусветная эканоміка не можа назваць сябе перадавой, калі не мае самыя сучасныя ІТ-тэхналогіі. Мы ганарымся, што ў Беларусі нарадзілася ІТ-індустрыя. Гэта неабходна нашаму грамадству, мы жадаем дэманстраваць сябе на знешніх рынках і ўдасканальваць. Праз удзел моладзі ў гэтым бізнесе мы здольны рухацца наперад больш інтэнсіўна. На прасторах краін СНД у нас самыя лепшыя вынікі ў гэтай сферы, таму ў нас многія жадаюць павучыцца, а мы не супраць прадаваць сваю інтэлектуальную ўласнасць. Сэнс гэтай выставы — у абмене вопытам і інфармацыяй.

Пра тое, што ў нашай краіне цалкам адкрытая інфармацыйная прастора, сведчаць наступныя лічбы: у Беларусі зарэгістравана 1,5 тысячы друкаваных медыя, больш за 250 электронных і 9 інфармацыйных агенцтваў. У краіне распаўсюджваецца 4 тысячы замежных сродкаў масавай інфармацыі. «Гэта значыць, у нас цалкам адкрытая прастора», — пацвердзіў і **міністр інфармацыі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**. Ён таксама адзначыў важнасць развіцця рэгіянальных СМІ. Апошні конкурс «Тэлевяршыня» паказаў, што намаганні дзяржавы ў гэтым кірунку далі свае вынікі. «Шмат класных рэгіянальных праектаў, — сказаў міністр. — Больш за тое, рэгіянальныя медыя акупляюцца амаль на 100%. У рэгіёнах адкрываюцца новыя тэлестудыі, газеты пераходзяць на каляровы друк, паляпшаецца якасць кантэнту, друкаваныя СМІ актыўна развіваюць свае сайты».

Неабходны элемент раўнавагі

На сёлетняй выставе прадстаўлена каля 600 выданняў сродкаў масавай інфармацыі. Аднак «СМІ ў Беларусі» — гэта не толькі стэнды ў Футбольным манежы, флэш-прэзентацыі і флаеры. Гэта семінары, майстар-класы, сустрэчы і нават працяг фэсту за межамі выставы. І, безумоўна, гэта не толькі беларускія медыя.

— Мы сёння ганарымся тым, што з'яўляемся знакавай пляцоўкай для шырокага кола рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, — расказала карэспандэнту «Звязды» **Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі,** намеснік старшыні аргкамітэта выставы. — Калегі з Масквы і Маскоўскай вобласці будуць актыўна працаваць і ў фармаце майстар-класаў. У выстаўцы ўдзельнічаюць нашы традыцыйныя партнёры з Індыі, Кітая, Венесуэлы, Кубы. Гэта краіны, якія дэманструюць не толькі сваю прэсу, але і сваё інфармацыйнае стаўленне да Беларусі — партнёрскае і паважлівае. Мы не ставілі задачы сабраць усіх, але нікому не адмовілі — усе ахвотныя ў выставе ўдзельнічаюць.

Тэма прэсы настолькі аб'ёмная і шырокая, што ў фармат удзелу на выставачнай пляцоўцы не ўмяшчаецца. Святкаванне працягнецца да 9 мая, калі ў парку імя Максіма Горкага ў Мінску адбудзецца Фестываль прэсы. Там журналісты і рэдактары сустрэнуцца са сваімі чытачамі і гледачамі. Зноў можна будзе ўбачыць вочы адзін аднаго, задаць пытанні і пачуць адказы, але галоўнае — адчуць душу. Гэта неабходны элемент для раўнавагі руху на вялікай хуткасці — адказнасць перад тымі, пра каго і для каго мы пішам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гран-пры ў нас!

Галоўная ўзнагарода IX Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Ліцера» — у «Звязды»

Навіна прыйшла, калі вярстаўся нумар: гран-пры ў намінацыі «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх, абласных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў» уручаны рэдакцыі газеты «Звязда» ***за праект «Вогненныя вёскі»****.*

Больш за 260 заявак паступіла на гэты конкурс — практычна ўсе нацыянальныя і рэгіянальныя СМІ традыцыйна ўзялі ў ім удзел. Сёлета журналісты спаборнічалі ў 23 намінацыях, у тым ліку «Лепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі», «Лепшыя матэрыялы эканамічнай тэматыкі», «Лепшыя матэрыялы сацыяльнай тэматыкі» і г.д.

Больш падрабязна пра імёны звяздоўскіх пераможцаў — у наступным нумары газеты.

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЦЫБУЛЬКА, намеснік начальніка дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:

«За постчарнобыльскі перыяд у краіне тэрыторыі зон адсялення і адчужэння скараціліся на 15,6% да 266,1 тыс. га. Гэта тая зона, дзе яшчэ ўстаноўлены і дзейнічае кантрольна-прапускны рэжым. У 2012 годзе праводзіліся спецыяльныя работы па паляпшэнні санітарнага стану на адселеных тэрыторыях, таксама ажыццяўляецца дэталёвая інвентарызацыя гэтых земляў, якая паказала, што ў абарачэнне можна вярнуць яшчэ каля 40 тыс. га пасля праверкі на наяўнасць радыенуклідаў. У асноўным гэтыя землі знаходзяцца ў поймах рэк, таму лепш за ўсё іх аддаваць пад пашавыя ўгоддзі».

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У РАСІІ ШУКАЮЦЬ БЕЛГАРАДСКАГА СТРАЛКА

Праваахоўныя органы Белгарадскай вобласці, а таксама суседніх рэгіёнаў Расіі і Украіны, амаль суткі ў рэжыме нон-стоп шукаюць падазраванага, які ўчыніў бойню ў цэнтры Белгарада. За інфармацыю пра белгарадскага стралка абвешчана ўзнагарода ў тры мільёны рублёў.

Матывам масавага забойства ў белгарадскай краме «Паляванне» стала адмова (з-за судзімасці) прадаць 31-гадоваму Сяргею Памазуну патроны. Ён паабяцаў вярнуцца і ўсіх забіць, але яго не ўспрынялі ўсур'ёз. Увечары 22 красавіка Памазун скраў у свайго бацькі карабін, стрэльбу, траўматычны пісталет і аўтамабіль «BMW X5», прыехаў у тую ж краму і застрэліў траіх прадаўцоў, а таксама выпадковых мінакоў: мужчыну і дзвюх старшакласніц. Пасля забойца выкраў з крамы зброю і ўцёк на «BMW X5», які неўзабаве кінуў. Памазун вырас у сям'і егера і чыноўніцы, неаднаразова быў судзімы за згоны. Супрацоўнікі калоніі кажуць, што ён здаваўся псіхічна нездаровым. Па вяртанні дадому Памазун заявіў, што парве з крыміналам, і адмовіўся размаўляць з ранейшымі сябрамі. Пры гэтым ён стаў паводзіць сябе агрэсіўна.

У Белгарадзе ў аўторак пачалася двухдзённая жалоба ў памяць аб загінулых.

САРА ПЭЙЛІН ЗАКЛІКАЛА БАМБІЦЬ ЧЭХІЮ

Скандальна вядомы амерыканскі палітык Сара Пэйлін заклікала да ўварвання ў Чэхію ў адказ на нядаўнія тэракты ў Бостане. Экс-губернатар Аляскі таксама заклікала да ядзернага ўдару па ісламскім свеце. Яна заявіла, што, хоць федэральныя агенты яшчэ не завяршылі расследаванне бостанскага тэракта, «час для актыўных дзеянняў у адказ ужо надышоў». «Мы яшчэ толкам нічога не ведаем пра гэтых падазраваных, але мы ўпэўнены ў тым, што яны мусульмане з Чэхіі», — заявіла Пэйлін падчас ток-шоу на канале Fox News. На такую заяву вядучыя шоу расказалі палітыку, што браты Царнаевы, абвінавачаныя ў выбухах у Бостане, з'яўляюцца зусім не чэхамі, а этнічнымі чачэнцамі, якія большую частку жыцця правялі ў Кыргызстане, адкуль і пераехалі ў ЗША. Аднак Пэйлін зусім не збянтэжылася і спакойна заўважыла: «Якая розніца? Хіба Чэхія — гэта не частка Расіі?» Невуцтва Сары Пэйлін выклікала вялікі рэзананс у амерыканскім грамадстве, дзе пачалі высмейваць палітыка.

У ГАЛАНДЫІ НАБІРАЮЦЬ ДОБРААХВОТНІКАЎ НАЗАЎЖДЫ ПАЛЯЦЕЦЬ НА МАРС

Афіцыйна адкрыты набор удзельнікаў праекта Mars One, які ўяўляе сабой падарожжа на гэтую планету ў адзін канец. Паводле задумы, да 2023-га павінна быць ажыццёўлена экспедыцыя на Марс. Першымі каланістамі гэтай планеты стануць чатыры астранаўты. Яны правядуць рэшту жыцця ў марсіянскім паселішчы, створаным аўтаматамі, загадзя дасланымі туды. Адзначаецца, што яшчэ да пачатку адбору ў фонд паступіла каля 10 тысяч заявак ад ахвотнікаў прыняць удзел у праекце. У выніку плануецца выбраць 24 кандыдатаў у астранаўты да ліпеня 2015 года. На працягу наступных сямі гадоў яны будуць рыхтавацца да палёту ў камандах па чатыры чалавекі. Кошт першага палёту ацэньваецца прыкладна ў 6 мільярдаў долараў, большую частку з якіх плануецца прыцягнуць дзякуючы продажу правоў на трансляцыю першага ў сваім родзе глабальнага рэаліці-шоу.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЧАЛАВЕЧАЕ СЭРЦА АДЧУВАЕ ПАХІ

Нямецкія навукоўцы ў выніку даследаванняў прыйшлі да высновы, што нюхальныя рэцэптары ёсць не толькі ў носе. Аказваецца, унутраныя органы таксама могуць адчуваць пахі, хоць і па-свойму. Да такой высновы прыйшлі Петэр Шыберле і яго калегі з Нямецкага даследчага цэнтра харчовай хіміі Інстытута Лейбніца.

На працягу чатырох гадоў Шыберле і яго калегі прытрымліваліся думкі, што кампаненты пахаў і смаку могуць мець дадатковыя функцыі. Нарэшце, даследчыкі засяродзілі сваю ўвагу на бялковых амінах — рэчывах з рэзкім пахам, якія змяшчаюцца ў напоях і ежы. Яны з'яўляюцца свайго роду хімічнымі пераносчыкамі інфармацыі, якія ўваходзяць у састаў такіх прадуктаў, як шакалад, мяса, малако і сыр.

Падчас эксперыменту навукоўцы вылучылі першасныя крывяныя клеткі з узораў крыві, каб паглядзець, як яны будуць рэагаваць на моцны пах ад ежы і напояў. Дзіўна, але падобна на тое, як мы цягнемся ў бок крыніцы водару, напрыклад, свежай кавы паводзяць сябе і клеткі крыві. Каманда Шыберле заключыла, што ў клетак крыві таксама ёсць нюхальныя рэцэптары. Правёўшы шэраг эксперыментаў, даследчыкі знайшлі пацвярджэнне сваёй першапачатковай здагадкі аб тым, што сэрца і лёгкія таксама могуць адчуваць пахі. Нюх унутраных органаў з'яўляецца часткай агульнага працэсу працы арганізма. Яно запускаецца, калі мы бачым смачную ежу і збіраемся яе з'есці. Гэты працэс даследчыкі называюць малекулярнай сэнсорыкай, або «сэнсомікай».

КАРАТКА

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў сакавіку гэтага года склала Br4 млн 692 тыс. 789 (у лютым — Br4 млн 504 тыс. 840).

Беларусь учора ў мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па крэдыце стэнд-бай Міжнароднага валютнага фонду ажыццявіла чарговае пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 54,7 млн СДР, што эквівалентна $82,4 млн.

Авіякампанія «Люфтганза» (Германія) 23 красавіка аднавіла авіязносіны паміж Мінскам і Франкфуртам. На працягу 22 красавіка былі адменены чатыры рэйсы авіякампаніі ў зносінах Мінск—Франкфурт з-за забастоўкі работнікаў нямецкага авіяперавозчыка.

Кубак Беларусі ў новым сезоне будзе перайменаваны ў Кубак Руслана Салея. Такое рашэнне прынята ўчора на выканкаме Федэрацыі хакея Беларусі.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь сумесна з замежным прыватным прадпрыемствам «Брытыш Амерыкан Табака Трэйдынг Компані» 8 мая прадставіць экспазіцыі «Партрэты правіцеляў і магнатаў Вялікага Княства Літоўскага» з музеяў Львова і Луцка і «Слуцкія паясы са збору Львоўскага гістарычнага музея». Выстаўка партрэтаў прадоўжыцца да 26 жніўня 2013 года, паясоў — да 18 красавіка 2014 года.

БЕЛИНВЕСТБАНК

Внимание! Акция!

ОАО «Белинвестбанк» до 1 июля 2013 года проводит акцию по досрочному погашению кредитов на потребительские нужды, выданных в белорусских рублях, процентная ставка по которым установлена в размере не более действующей ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (включительно).

Дополнительную информацию можно получить в отделениях ОАО «Белинвестбанк» и по телефонам

146 КОНТАКТ-ЦЕНТР

либо 8 (017) 239-02-39

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29 УНП 807000028

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 27.10.2006

ПРЭЗІДЭНТ ПАВІНШАВАЎ

...Арасіа Мануэля Картэса Хаару

З выбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Парагвай. «Беларусь зацікаўлена ў развіцці плённых сувязяў з Парагваем, больш поўным выкарыстанні патэнцыялу двухбаковага партнёрства ў гандлёва-эканамічнай сферы і пашырэнні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў рамках міжнародных арганізацый», — гаворыцца ў віншаванні.

...Джорджа Напалітана

Джорджа Напалітана з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Італьянскай Рэспублікі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

■ З нагоды

МОЦНЫ ШЧЫТ ВАЕННАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

У рамках рабочага візіту ў Мінск міністра абароны Расійскай Федэрацыі генерала арміі Сяргея Шайгу адбылося чарговае пасяджэнне сумеснай Калегіі міністэрстваў абароны Беларусі і Расіі.

У ходзе пасяджэння абмяркоўваліся пытанні, якія тычацца функцыянавання рэгіянальнай групоўкі войскаў, ваенна-навуковага супрацоўніцтва, топагеадэзічнага забеспячэння ўзброеных сіл і сумеснай дзейнасці ў галіне радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. Па ўсіх пытаннях, разгледжаных сумеснай Калегіяй, былі прынятыя ўзгодненыя рашэнні.

— Пасяджэнне сумеснай Калегіі міністэрстваў абароны — чарговы пункт судакранання ваенных ведамстваў па шэрагу пытанняў стварэння новых і ўдасканалення ўжо дзейных сістэм забеспячэння бяспекі ў ваеннай сферы, — зазначыў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН**. — Штогод мы адзначаем умацаванне абарончага патэнцыялу саюзнай дзяржавы, што з'яўляецца сведчаннем незваротнасці працэсу ваеннай інтэграцыі дзвюх дзяржаў.

Удзельнікамі пасяджэння быў разгледжаны і ход рэалізацыі другога этапу стварэння і развіцця аб'яднаfar сістэмы радыёэлектроннай барацьбы, у рамках якога сёлета пачнуць дзейнічаць Праграма баявой падрыхтоўкі воінскіх часцей і падраздзяленняў, а таксама Сістэма падрыхтоўкі органаў кіравання і войскаў да радыёэлектроннай барацьбы ў складзе рэгіянальнай групоўкі.

— Расійскі бок разглядае ваенную інтэграцыю як эфектыўны рэгіянальны механізм супрацьдзеяння новым выклікам і пагрозам сумеснай бяспекі, — перакананы **міністр абароны Расійскай Федэрацыі генерал арміі Сяргей ШАЙГУ**. — І тут мы поўнасцю абапіраемся на падтрымку Беларусі. Расійска-беларускае супрацоўніцтва развіваецца дынамічна, носіць стратэгічны характар міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, што пацвярджаецца дзейнымі пагадненнямі ў ваеннай сферы. Былі падведзены вынікі выканання ў 2012 годзе Комплекснай праграмы міжведамаснага ваенна-навуковага супрацоўніцтва на 2011—2015 гады і вызначаны перспектывы на астатні перыяд яе дзеяння.

Вераніка КАНЮТА

■ Супрацоўніцтва

ДАСЯГНЕННІ КУБІНСКАЙ МЕДЫЦЫНЫ — У НАШУ ПРАКТЫКУ

У Мінскім кансультацыйна-дыягнастычным цэнтры адбылася сустрэча яго супрацоўнікаў з прадстаўнікамі пасольства Кубы ў Беларусі.

Новым старшынёй таварыства дружбы «Беларусь — Куба» цяпер з'яўляецца галоўны ўрач дыягнастычнага цэнтра Анатоль Талкачоў. Пасля яго нядаўняга выбрання дзейнасць таварыства значна актывізавалася, узмацніліся сувязі з кубінскім пасольствам. Па-другое, сусветны аўтарытэт і бясспрэчныя дасягненні сістэмы аховы здароўя на Кубе агульнавядомыя, яны — прыклад для многіх іншых краін. І развітых таксама. Таму супрацоўнікі дыягнастычнага цэнтра, персанал якога ўяўляе сабой калектыў медыкаў высокай кваліфікацыі, дзе ўважліва сочаць за дасягненнямі сваіх замежных калег, з цікавасцю слухалі гасцей. Асабліва пасла Альфрэда Партуанда, які, у прыватнасці, расказаў аб апошніх дасягненнях навуковых цэнтраў аховы здароўя яго краіны. Ён паведаміў, што на Кубе інвестуюцца вялікія сродкі ў развіццё біятэхналогій, генай інжынерыі, у вытворчасць вакцын і розных медыкаментаў. Гэта стала магчымай дзякуючы падрыхтоўцы вялікай колькасці спецыялістаў высокай кваліфікацыі. Першасную медыцынскую дапамогу насельніцтву часцей за ўсё аказвае сямейны ўрач. Пры неабходнасці ён іх можа накіраваць да «вузкіх» спецыялістаў. Усе віды медыцынскай дапамогі на Кубе бясплатныя.

Саветнік пасольства Наташа Алігера ў размове з супрацоўнікамі цэнтра зазначыла, што падчас візіту на Кубу Прэзідэнта Беларусі былі дасягнуты дамоўленасці аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах, у тым ліку і медыцынскай. Быў падпісаны дакумент аб перадачы тэхналогій па вытворчасці ў Беларусі новых якасных і эфектыўных лекаў, у першую чаргу для лячэння ракавых захворванняў. Наташа Алігера гаворыць, што ў хуткім часе досвед кубінскіх фармацэўтаў будзе служыць на карысць беларускім людзям.

Леанід ТУГАРЫН

■ Праверка на дарогах

«НЕ ВІНАВАТЫ Я...»

Закрыюць адну фірму — будзе новая

Ці можна пасажыру не плаціць за праезд? Здавалася б, пытанне недарэчнае. Як гэта — не разлічыцца за аказаную вам паслугу? Але, аказваецца, такое права ў кліента можа з'явіцца. Калі пасля заканчэння паездкі таксіст не выдасць пасажыру касавы чэк, то апошняму зусім не абавязкова плаціць. І няўжо ў такім выпадку кіроўца, які парушае правілы перавозак, выкліча на дапамогу міліцыю?

Пра гэта карэспандэнт «Звязды» даведаўся ў гаспадарчым судзе Гродзенскай вобласці, дзе вельмі часта разглядаюцца розныя парушэнні ў сферы таксаматорных перавозак.

Да «бамбілаў» літасці не будзе

Да ведама таксістаў, што не плацяць падаткі, займаючыся падвозам без ліцэнзіі: ужо ёсць факты канфіскацыі ў іх транспартных сродкаў. І, верагодна, гэтая практыка будзе пашырацца.

— На жаль, прымяненне гаспадарчымі судамі захадаў прафілактычнага характару і фінансавыя спагнанні належнага выніку не даюць. Таму нелегальныя таксісты павінны разумець, што яны самі садзейнічаюць прымяненню супраць іх больш жорсткіх мер, да якіх раней суды стараліся не звяртацца. Каб прымусіць так званых «бамбілаў» задумацца: ці варта займацца парушэннямі, якія рэальна пагражаюць стратай аўтамабіля? — папярэджвае **намеснік старшыні гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Дзяніс ВАЛДАЙЦАЎ**.

Зрэшты, ёсць і другі «бок медаля». Афіцыйныя таксісты справядліва абвінавачваюць «бамбілаў» у несумленнай канкурэнцыі, але і самі дапускаюць шмат парушэнняў. Адна з такіх спраў разглядалася нядаўна гаспадарчым судом у Гродне.

Апошні працэс «ФартСэрвіса»

У суд былі запрошаны дырэктар прыватнага транспартнага ўнітарнага прадпрыемства «ФартСэрвіс», а таксама таксіст, «дзякуючы» якому працэс і распачаўся. Пэўна, апошні для гэтай фірмы, паколькі з 2 красавіка Міністэрства транспарту і камунікацый пазбавіла яе ліцэнзіі. За якія «грахі»?

Згодна з інфармацыяй **намесніка начальніка аддзела кантролю транспартнай дзейнасці філіяла транспартнай інспекцыі па Гродзенскай вобласці Вадзіма ВАСІЛЬЕВА**, летась у гаспадарчы суд былі накіраваны 204 пратаколы аб грубых правапарушэннях з боку фірмаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, што аказваюць паслугі таксі. Было анулявана каля 50 ліцэнзій. Аднак законапаслухмянасці не прыбавілася: за першы квартал судом разгледжаны 44 справы і на падыходзе чарговыя. Як правіла, парушэнні датычацца непраходжання кіроўцамі перадрэйсавага медыцынскага агляду і перавозкі пасажыраў без тэхнічнага агляду аўтамабіля. Альбо выкарыстання машыны ў асабістых мэтах (без дарожнага ліста, але з плафонам і іншымі атрыбутамі таксі), калі кіроўца фактычна працуе як нелегал.

Штрафныя санкцыі складаюць ад 10 да 500 базавых велічынь (50 мільёнаў рублёў), праўда, пакуль «нелегалаў» рэдка караюць па максімуме. Можа, і па гэтай прычыне некаторыя фірмы паўторна прыцягваюцца да адказнасці за ігнараванне правілаў перавозак. Некаторыя кіраўнікі ўжо ходзяць у суд амаль як на працу. Напрыклад, для «ФартСэрвіса» парушэнне, якое стала апошнім «цвіком у труну» фірмы, было ўжо дзявятым. Прычым «вызначыўся» той жа кіроўца, якога за такое ж парушэнне (непраходжанне абавязковых перадрэйсавых працэдур) затрымалі некалькі месяцаў назад.

— Сваёй асабістай віны не бачу, — адразу ж заявіў у зале суда дырэктар фірмы, якая пасля заканчэння ліквідацыйных мерапрыемстваў ужо не будзе існаваць.

У Віктара В., аказваецца, усё ў ажуры. Штомесячна праводзіцца інструктаж з усімі кіроўцамі наконт правілаў перавозак, у кожнага з іх ёсць службовая інструкцыя, дзе пазначаны ўсе абавязкі. Фірма заключыла дагаворы з медыкамі і механікамі ў розных месцах горада, аплачвае іх паслугі, каб у таксістаў не было праблем з праходжаннем перадрэйсавага агляду.

— Але ж трапляюцца нядобрасумленныя кіроўцы. І не звольніш — сям'я, дзеці ў чалавека, працаваць трэба, — кажа дырэктар пра сваю добрую душу.

Праўда, як можна трымацца за працу пры гадавым даходзе... 2,5 мільёна рублёў? Як забяспечваць сям'ю на такія грошы? Ды і хіба ж сапраўды магчыма, каб чалавек, адпрацаваўшы за месяц 17-18 дзён, зарабіў толькі 200 тысяч рублёў? Менавіта такой, калі верыць справаздачнасці фірмы, была летась зарплата таксіста. Прычым гэта не адзінкавы выпадак і характэрны ён не толькі для гэтага прадпрыемства. І тут, на думку намесніка старшыні гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Дзяніса Валдайцава, напрошваюцца два варыянты. Першы: кіроўцы працуюць «цішком» ад бухгалтэрыі фірмы, як той жа «бамбіла». І другі: фірма, прымаючы ад таксістаў наяўныя грошы, пазначае ў справаздачнасці несапраўдную выручку, каб плаціць менш падаткаў.

Працаваць «па-чорнаму» ці «па-беламу»?

Падобная «чорная» сістэма фінансавых узаемаадносін, пэўна, і з'яўляецца прычынай таго, што ў той жа фірме «ФартСэрвіс», ды і ў іншых арганізацыях таксі пры працаўладкаванні з кіроўцамі не заключаліся дагаворы аб матэрыяльнай адказнасці і вельмі рэдка спаганялі накладзеныя на прадпрыемства штрафы з канкрэтных вінаўнікаў. Што дазваляе ім парушаць зноў. Заключыш падобны дагавор, і ніхто не пойдзе да такога наймальніка працаваць?..

Альбо такая «дробязь»: па выніках месяца можна ўзяць звесткі з журнала дыспетчара аб колькасці заказаў, што выканаў кіроўца, і зверыць з грашовым паступленнем у касу фірмы. І ўсё становіцца зразумела, празрыста. Здавалася б, элементарна, але гэтага не робіцца: нікога не задавальняе такая празрыстасць?

З улікам ранейшых парушэнняў і іншых абставін гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці аштрафаваў фірму «ФартСэрвіс» на 200 базавых велічынь — 20 мільёнаў рублёў.

Дарэчы, калі прадпрыемства-перавозчык пазбаўляецца ліцэнзіі, то на працягу года апошняя паўторна не выдаецца. Аднак можна зарэгістраваць новую фірму з іншай назвай, напрыклад, да ранейшай дадаць слова «плюс».

Віктар В. аб гэтым ужо паклапаціўся — нядаўна зарэгістраваў новую фірму. Кажа, што хоча працаваць «па-беламу» і будзе вельмі сур'ёзна ставіцца да падбору кадраў.

Пахвальнае імкненне. Калі такое жаданне ажыццявіцца і пацвердзіцца праверкамі на дарогах.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Аўтаэкалогія

ЗДАЎ СТАРЫЯ «КОЛЫ» — АТРЫМАЙ ЗНІЖКУ НА НОВЫЯ

Сёлета стартуе новая праграма па ўтылізацыі аўтатранспарту Trade in.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цяпер за здачу на ўтылізацыю старога аўтамабіля любой маркі і года выпуску кліент можа набыць са зніжкай новае аўто ў дылераў холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс», паведаміў учора намеснік генеральнага дырэктара холдынга Андрэй Праватараў.

Падобная праграма Trade in дзейнічала і летась, аднак патрабаванні па здачы старых аўто былі даволі жорсткімі, што істотна замаруджвала яе развіццё. З мая па снежань 2012 года было здадзена на ўтылізацыю 236 аўто ад арганізацый і фізічных асоб.

Не сакрэт, што праблема ўтылізацыі старых «колаў» у буйных гарадах Беларусі з кожным годам пагаршаецца, таму яе вырашэнне патрабуе дадатковых стымулаў, адзначыў намеснік гендырэктара акцыянернага таварыства «Белдругчармет» Сяргей Гладкі. Таму ў новай праграме максімальна зняты абмежаванні па здачы аўталому. Прыём старых аўтамабіляў ажыццяўляецца на спецыялізаванай пляцоўцы ў Гатаве.

Сяргей ПАЛІНІН

■ Супрацоўніцтва

У ВІЛЬНЮС — З КАМФОРТАМ

З мая пасажыры цягніка Вільнюс—Мінск працэдуры мытнай і пагранічнай праверкі будуць праходзіць да пасадкі ў цягнік, у падземным пероне Вільнюскага чыгуначнага вакзала. Тут жа працэдуры праверкі пройдуць і пасажыры, якія прыехалі з Мінска. Раней для гэтых мэт цягнік спыняўся на прыгранічнай станцыі Кена.

Цяпер у адным з пешаходных тунэляў Вільнюскага вакзала ладзіцца абсталяванне, неабходнае для сучасных пунктаў пагранічнага і мытнага кантролю. У тым ліку сучасная сістэма кантролю багажу.

«Гэтая апаратура зможа за адну гадзіну праверыць 700 адзінак багажу. Дзякуючы ёй, праверка пасажыраў не затрымае. Акрамя таго, для павелічэння бяспекі будуць усталяваны і сістэмы відэаназірання, якія фіксуюць рух пасажыраў, якія ад'язджаюць», — кажа Гедрус Зайцевас, адзін з дырэктараў фірмы «Фіма», якая ставіць тут апаратуру.

Прадстаўнікі мытні абяцаюць, што змяненне працэдуры праверкі не выкліча нязручнасцяў для пасажыраў.

«Новы рэжым кантролю будзе больш зручным. Да гэтага часу праверка пасажыраў і іх багажу праводзіцца ў цягніку, які стаіць на станцыі Кена. У выніку чаго працэдура перасячэння дзяржаўнай мяжы і афармленне мытных дакументаў зацягвалася. Цяпер пастаянны цягнікоў не будзе. Новы парадак дазволіць таксама больш эфектыўна змагацца з увозам забароненых тавараў, або тых, якія маюць абмежаванне ў аб'ёмах. Праверка пасажыраў і іх багажу да гэтага часу праводзіцца выбарачна, праз фізічны агляд багажу, які выклікае падазрэнне. Пасля ўвядзення новага парадку ў Вільнюсе будзе праверан багаж усіх пасажыраў, таму ні ў кога не будзе магчымасці пазбегнуць мытнай праверкі», — сказаў карэспандэнту газеты «Звязда» прадстаўнік Мытнага дэпартамента Стасіс Вайцекаўскас.

Пасля ўвядзення новага парадку ў Вільнюсе будзе праверан багаж усіх пасажыраў.

Паводле звестак акцыянернага таварыства «Літоўскія чыгункі», змяненне месца пагранічных праверак зробіць падарожжа паміж сталіцамі Літвы і Беларусі больш камфортным, час у дарозе скароціцца на паўгадзіны — гэта значыць, да дзвюх з паловай гадзін.

На Вільнюскім чыгуначным вакзале з мая будзе праводзіцца і мытны, і пагранічны кантроль.

«Колькасць пасажыраў, якія едуць цягніком па маршруце Вільнюс — Мінск — Вільнюс, увесь час павялічваецца. У 2012 годзе паміж абедзвюма сталіцамі праехалі 269 тыс. чалавек. Гэта на 65,6% больш, чым у 2011 годзе. Сёлета толькі за першы квартал па маршруце Вільнюс — Мінск — Вільнюс праехала 76 тыс. пасажыраў, што на 30% больш, чым за першыя тры месяцы мінулага года, — сказаў карэспандэнту газеты «Звязда» генеральны дырэктар АТ «Літоўскія чыгункі» Стасіс Дайлідка. — Мы імкнёмся не толькі якасна абслугоўваць пасажыраў (а іх паток увесь час павялічваецца), але і скараціць час паездкі. Сёлета мы плануем на гэтым маршруце пусціць новыя сучасныя дызельныя цягнікі, здольныя развіваць хуткасць да 140 км у гадзіну. Акрамя таго, мы пачалі электрыфікаваць участак чыгункі Новая Вільня — Кена. Беларускія чыгуначнікі будуць электрыфікаваць дарогу ад Маладзечна да дзяржаўнай мяжы. У выніку ад Мінска да Клайпеды дарога будзе электрыфікаваная. Дызельныя цягнікі заменім электрычкамі, якія могуць ехаць з хуткасцю да 160 км у гадзіну. У 2015 годзе з Вільнюса ў Мінск можна будзе даехаць за дзве гадзіны. Мы вельмі цэнім плённае супрацоўніцтва з Беларускай чыгункай».

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.

Вільнюс

■ Факт

ДАПУШЧАНЫ ЎЗРОВЕНЬ АЛКАГОЛЮ Ў КРЫВІ ВАДЗІЦЕЛЯЎ МОЖА БЫЦЬ ЗНІЖАНЫ

У Беларусі разглядаецца пытанне аб зніжэнні дапушчальнага ўзроўню наяўнасці алкаголю ў крыві для некаторых катэгорый вадзіцеляў. Пра гэта ўчора на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Дыскусійныя пытанні наркалогіі: маніторынг, прафілактыка, лячэнне, рэабілітацыя» паведаміў галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Сяргей Осіпчык, перадае **БЕЛТА**.

«У рамках прафілактыкі кіравання транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення разглядаецца пытанне аб зніжэнні дапушчальнага ўзроўню наяўнасці алкаголю ў крыві з 0,3 да 0,15 праміле для дзвюх катэгорый вадзіцеляў — са стажам ваджэння да 5 гадоў і прафесійных вадзіцеляў», — сказаў Сяргей Осіпчык.

МЯЖУ ЎЗЯЎ ШТУРМАМ...

Чатыры гады пазбаўлення волі атрымаў грамадзянін Расіі, які ўехаў на тэрыторыю нашай краіны ў студзені гэтага года.

І не проста ўехаў: Валерый Ш. рухаўся, не зважаючы на межы, што з'яўляецца грубым парушэннем закона. Апошнім часам ён жыў у Германіі. Там у расіяніна, як ён тлумачыў суду, няўдачы пайшлі паласой. Апошняй кропляй стала расставанне з дзяўчынай. Куды цягне чалавека, калі ён у роспачы? Вядома, на радзіму. Так і Валерый пабег ад здрады і пакут у Расію. Па нявысветленых прычынах для падарожжа ён скарыстаўся аўтамабілем новага кавалера сваёй дзяўчыны. На ім хутка пераадолеў Германію, Польшчу. Першымі западозрылі нядобрае польскія памежнікі, сталі высвятляць асобу вадзіцеля. Тады ён націснуў на газ, літаральна «праляцеў» польскі пункт пропуску, не стаў спыняцца і на беларускім. Машынай разнёс шлагбаум і іншыя загараджальныя збудаванні на пункце пропуску «Дамачава». Потым заехаў у вёску Гута, дзе папрасіўся на начлег. Там яго і затрымалі міліцыянеры.

Яна СВЕТАВА.

СЕТКІ ЗА КАЛЮЧЫМ ДРОТАМ

Супрацоўнікі аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі і Мазырскай міжрайінспекцыі на разводдзі Прыпяці знайшлі чатыры стаўныя сеткі агульнай даўжынёй каля 100 метраў.

З не зусім звычайнага тут тое, што нехта ўстанавіў іх у забароненай зоне чыгуначнага моста, агароджанай калючым дротам. Калі ў прысутнасці начальніка стралковай каманды па ахове гэтага аб'екта сеткі дасталі з вады, у іх знаходзіўся ўлоў агульнай вагой 13 кілаграмаў. Шкода навакольнаму асяроддзю ацэненая ў 6,9 мільёна рублёў. Цяпер Мазырскі РАУС па гэтым факце праводзіць праверку.

Сяргей РАСОЛЬКА

ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАВЫШАНА ЗАРПЛАТА ВЫХАВАЛЬНІКАМ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Адпаведную пастанову «Аб павышэнні заработнай платы выхавальнікам дашкольнай адукацыі і памочнікам выхавальнікаў» Савет Міністраў Беларусі прыняў 22 красавіка 2013 года, паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

У адпаведнасці з артыкулам 63 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і ў мэтах удасканальвання аплаты працы асобных катэгорый работнікаў сістэмы адукацыі павышаны тарыфныя стаўкі (аклады) выхавальнікам дашкольнай адукацыі і памочнікам выхавальнікаў установ адукацыі, а таксама іншых арганізацый, якія маюць права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі імі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю. Выхавальнікам аклады павышаны на 25%, памочнікам выхавальніка — на 10%. Пастанова распрацавана ў мэтах рэалізацыі даручэння кіраўніка дзяржавы. Уваходзіць у сілу з 1 ліпеня 2013 года.

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ВЫЦЯГНУЛІ З ВОЗЕРА ДВУХ ХЛОПЧЫКАЎ

У Лідзе выратавальнікі выцягнулі з возера двух хлопчыкаў, паведаміў БЕЛТА старшыня гродзенскай абласной структуры АСВОД Сяргей Шурба.

12-гадовыя школьнікі вярталіся дадому з трэніроўкі па футболе, перакідваючыся мячом. Мяч выпадкова зваліўся ў возера ў цэнтры горада, і адзін з хлопчыкаў вырашыў дастаць яго, прабраўшыся па лёдзе. Дзіця правалілася ў ваду, другое кінулася яго ратаваць і таксама апынулася ў вадаёме. Крыкі дзяцей пачулі вадалазы выратавальнай станцыі і дапамаглі ім выбрацца.

З пачатку года на вадаёмах Гродзенскай вобласці не было лятальных выпадкаў на вадзе. Выратавана трое дзяцей. Таксама сёлета выратавальнікі папярэдзілі аб небяспецы 440 чалавек, пераважна рыбакоў.

ЛЕГЕНДАРНАМУ ПАРТЫЗАНУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Аўтамабільны крос, прысвечаны памяці легендарнага партызанскага камандзіра Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова, адбудзецца пад Віцебскам.

У гонках возьмуць удзел наймацнейшыя аўтагоншчыкі Беларусі і Расіі. Падчас аўтакросу будзе разыграны І этап першынства Рэспублікі Беларусь. Свята спорту адбудзецца 27-28 красавіка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У СТАЛІЦЫ З'ЯВЯЦЦА ЯШЧЭ ЧАТЫРЫ БЮДЖЭТНЫЯ ГАСЦІНІЦЫ

Дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне «Мінскбуд» узводзіць у сталіцы чатыры гасцініцы з панэльных канструкцый.

Яны папоўняць мала прадстаўлены ў горадзе сегмент падобных аб'ектаў эканом-класа, паведамілі ў дзяржаўным вытворчым аб'яднанні «Мінскбуд». Новыя будынкі ўзводзяцца на вуліцах Каржанеўскага, Нарачанскай, Кашавога. Чацвёртая гасцініца з'явіцца ў Парку высокіх тэхналогій на вуліцы Купрэвіча.

Кожная гасцініца будзе разлічана на 265 чалавек. Праекціроўшчыкі размясцілі тут 2 люксы і 77 адна- і двухпакаёвых нумароў. Але асноўны фонд — гэта блокі з двух пакояў, кожны з якіх разлічаны на пражыванне трох чалавек. Пры гасцініцах адкрыюць кавярню на 70 месцаў. Нягледзячы на тое, што ўсе аб'екты пабудаваны па адным і тым жа праекце, яны будуць рознымі звонку і ўнутры за кошт колеравага рашэння фасадаў і інтэр'еру.

Вольга ЖАРЫНА, «Мінск-Навіны».

ФАКТЫ

ПАКАРАЛІ ЗА ПРЫРОДУ

У 1-м квартале бягучага года ў Віцебскай вобласці за розныя парушэнні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці 620 правапарушальнікаў прыродаахоўнага заканадаўства.

Штрафы заплацілі 350 службовых асоб на агульную суму 87,8 мільёна рублёў. Былі таксама аштрафаваны каля 100 грамадзян на даволі значную суму — 29,8 мільёна рублёў, 100 юрыдычных асоб — на 140 мільёнаў рублёў. Сярод іншага высветлілася, што ў Віцебскім раёне фермерская гаспадарка «Дубрава» і эксперыментальная база «Тулава» ажыццяўляюць самавольнае водакарыстанне. Двойчы быў аштрафаваны кіраўнік «Дубравы», які заплаціў 4,2 мільёна рублёў, а бюджэт вышэйназванай базы паменшыўся на мільён рублёў.

У Гарадоцкім раёне эколагі зафіксавалі, што ля фермы знаходзіліся мінеральныя ўгнаенні і арганіка... Як паведамілі ў Камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віцебскай вобласці, аператыўнымі групамі камітэта і інспекцыямі штотыдзень праводзяцца рэйдавыя мерапрыемствы па пытаннях навядзення парадку. Праведзены выбарачныя абследаванні тэрыторый населеных пунктаў, сельскагаспадарчых і іншых аб'ектаў у раёнах вобласці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання ВАЙЦЯНКОВА Мікалая Рыгоравіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

ПрофитБрокер
страховой брокер

БАЛАНС на 1 января 2012 года

млн руб.

АКТИВ	На 31 декабря 2012	На 31 декабря 2011	ПАССИВ	На 31 декабря 2012	На 31 декабря 2011
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			**III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**		
Основные средства	1	1	Уставный капитал	2	2
			Нераспределенная прибыль	46	-82
ИТОГО по разделу I	**1**	**1**	**ИТОГО по разделу III**	**48**	**-80**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			**IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**		
Запасы	1	1		-	-
Расходы будущих периодов	2	2	**V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**		
Краткосрочная дебиторская задолженность	38	17	Краткосрочные кредиты и займы	-	104
Денежные средства и их эквиваленты	24	8	Краткосрочная кредиторская задолженность	18	5
ИТОГО по разделу II	**65**	**28**	**ИТОГО по разделу V**	**18**	**109**
БАЛАНС	**66**	**29**	**БАЛАНС**	**66**	**29**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2012 года

млн руб.

Наименование показателей	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	389	44
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	-	126
ВАЛОВАЯ ПРИБЫЛЬ	**389**	**-82**
Управленческие расходы	219	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**170**	**-82**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) по текущей деятельности	**170**	**-82**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	**170**	**-82**
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**170**	**-82**
СОВОКУПНАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**170**	**-82**

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности ООО «ПрофитБрокер» за 2012 г.

Аудиторское мнение

По моему мнению, прилагаемая к настоящему аудиторскому заключению бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО «ПрофитБрокер», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «ПрофитБрокер» на 1 января 2013 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2012 г., при этом совершенные ООО «ПрофитБрокер» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

Дата аудиторского заключения 21 февраля 2013 г.

Аудитор-индивидуальный предприниматель Ткач Светлана Ивановна.

Свидетельство о государственной регистрации от 24 августа 2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом, квалификационный аттестат аудитора № 0000077 от 01.10.2002 г. выдан Министерством финансов Республики Беларусь.

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

24 красавіка 2013 г.
№ 8 (306)

НОВЫ ПОГЛЯД НА «ХВАРОБЫ» ПАЛІКЛІНІК

Барыс ПРАКОПЧЫК

У Гродне 1-я дарослая і 1-я дзіцячая паліклінікі сталі самастойнымі юрыдычнымі асобамі. З ліпеня статус юрыдычнай асобы атрымаюць і іншыя гарадскія паліклінікі. Чым гэта выклікана і як такі крок мясцовых улад адаб'ецца на медыцынскім абслугоўванні гараджан?

У 2005 годзе ў Гродзенскім гарвыканкаме быў скасаваны аддзел аховы здароўя, а замест яго кіруючыя функцыі па арганізацыі пярвічнай медыцынскай дапамогі перадалі цэнтральнай гарадской паліклініцы. У яе структуру ўвайшлі 9 філіялаў — 6 гарадскіх паліклінік, 2 дзіцячыя, а таксама Скідальская гарадская бальніца з паліклінікай. Такім чынам, адна медустанова адказвала ўжо не толькі за сябе, але і за 9 іншых — за паліклінічнае абслугоўванне амаль 400 тысяч жыхароў абласнога цэнтра і Гродзенскага раёна.

Ці па сілах адной паліклініцы была такая «махіна»? І наколькі жыццяздольны падобны кангламерат, калі, па сутнасці, у роўнага сярод роўных раптам становіцца больш паўнамоцтваў? Ці будзе ён у аднолькавай меры клапаціцца пра інтарэсы не толькі сваёй установы, але і ўсіх філіялаў?

Нешта не чуваць, каб хтосьці назваў гэтую рэформу крокам наперад. Па аб'ектыўных, а можа, і суб'ектыўных прычынах дакладнай сістэмы аказання паліклінікамі медыцынскай дапамогі не атрымалася. І з кожным годам гэта было ўсё больш відавочна не толькі спецыялістам, аб чым сведчылі і шматлікія звароты людзей. Паводле інфармацыі **намесніка начальніка ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Наталлі АНТАНОВІЧ,** з амаль 600 мінулагодніх зваротаў трэць датычылася менавіта цэнтральнай гарадской паліклінікі і яе філіялаў.

Якія ж асноўныя «балячкі» гарадскіх паліклінік? У гэтым дакладна разабраліся, рыхтуючы калегію абласнога ўпраўлення аховы здароўя па аптымізацыі медустаноў Гродна і Гродзенскага раёна. Аказалася, што праблема не толькі ў адставанні паліклінічных магутнасцяў ад пашырэння горада і з'яўлення новых мікрараёнаў, але і ў арганізацыйных пралікаў па замацаванні жыхароў за паліклінікамі. Магутнасці адной выкарыстоўваюцца не цалкам, а ў іншай такая перагрузка, што на ўчасткавага ўрача прыходзіцца амаль 4 тысячы чалавек. Адсюль — чэргі, праблемы з талонамі на прыём да ўрача, нездаволенасць людзей. Ды і хіба ж рэальна пры такой нагрузцы забяспечыць якасную медыцынскую дапамогу?

На думку Наталлі Антанавіч, адна з галоўных праблем пры адсутнасці юрыдычнай самастойнасці ўстановы, яе існаванні ў статусе філіяла — гэта пасіўнасць, інертнасць некаторых кіраўнікоў. Быццам за ўсё павінна была адказваць цэнтральная паліклініка, а іх «хата», як той казаў, з краю. Але з такой пазіцыяй вынікаў, зразумела, не будзе. Шмат надзённых пытанняў, якія маглі быць вырашаны за кошт зусім не жабрацкага гарадскога бюджэту, заставаліся на «задворках». І па рамонце будынкаў паліклінік, і па ўкараненні сучасных тэхналогій...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Магутная помпа высушыць увесь участак амаль за гадзіну.

АПОШНЯЯ ВАДА

НА ДАПАМОГУ СПАДЗЯВАЙСЯ, АЛЕ І САМ НЕ ЗЛЕНІВАЙСЯ СТАРАЙСЯ

Хоць у Барысаўскім краі і шмат рэк, сёлета Бярэзіна, Пліса, Бобр не прынеслі гаспадарам столькі галаўнога болю, як талыя воды. Падчас апошняга снегападу ў раёне выпала да сарака сантыметраў снегу, а выглянула вясновае сонца — і хутка разліліся лужыны і невялікія рачулкі на падворках і агародах.

Начальнік Барысаўкага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр БОБРЫК паказвае на карце раёна падтапленні.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На падворку па вуліцы Лугавой, што ў Барысаве, актыўна адкачваюць ваду, што падступіла да самай хаты. Унутр вада не прабралася, мы застаём толькі рэшткі, але і гэта бяда для людзей. Яшчэ якая гадзіна — і вады як не было. Магутная помпа высушыла ўвесь участак. У свой час дамы тут былі пабудаваны «на балоце». Вось і атрымліваецца, што вада «падпірае» і знізу, і зверху, не паспявае сходзіць.

— Для спецыяльных служб тут працы кожны год хапае, толькі маштабы розныя, — распавядае намеснік начальніка Барысаўкага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Руслан КОМАР. — Можна абмежавацца і пятнаццацю адрасамі. Сёлета ж іх — каля шасцідзесяці.

Едзем па вуліцах, дзе ёсць падтапленні. У МНС адзначаюць: зараз вада ў асноўным толькі паміж градамі. Але па кожнай, нават самай нязначнай, заяўцы супрацоўнікі абавязкова выязджаюць на месца, каб ацаніць сітуацыю.

— Калі ёсць рэальная пагроза падтаплення ці вада ў доме — тады мы арганізуем адпампоўку сіламі ЖКГ, водаканала, арганізацый, якія маюць на ўзбраенні свае мотапомпы, а калі ёсць пагроза для жыхароў — нашымі сіламі, — кажа начальнік Барысаўкага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр БОБРЫК. — Калі ж пагрозы няма, а талыя воды стаяць у дварах, мы людзям тлумачым, што трэба пракапаць тут каналы, бо займацца гэтым у нас часу няма. Гаспадар павінен сам рыхтавацца да складанага перыяду.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПРЫВАТНАЕ — ЧАСТКА АГУЛЬНАГА

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Вясна — традыцыйна напружаны час для руплівых гаспадароў, якія маюць прыватныя падсобныя гаспадаркі. Зямля чакаць не любіць. І калі ёсць жаданне атрымаць добры ўраджай, трэба своечасова яе апрацаваць. А тыя, хто трымае жывёлу, занятыя па гаспадарцы фактычна круглы год. Таму без дапамогі мясцовай улады абысціся вяскоўцам, якія маюць асабістыя падсобныя гаспадаркі, цяжка.

Гэтае пытанне было агучана падчас правядзення чарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў. У сваёй справаздачы Аляксандр Ацясаў, старшыня аблсавета, агучыў: на Віцебшчыне налічваецца каля 147,9 тысячы прыватных гаспадарак. Менш, чым летась, але ўсё ж... Лічбы таго, што даюць прыватныя падворкі дзяржаве, па-добраму ўражваюць. У прыватнасці, летась грамадзяне здалі дзяржаве каля 80% ад валавога збору бульбы, 80% гародніны, 94% ягад і пладоў, 1/5 частку малака. Цікава, што менавіта на Віцебшчыне лепшы паказчык у Беларусі па зборы малака — 72 тысячы тон.

Агульны даход «уладароў сяла» летась склаў каля 392 мільярдаў рублёў — у сярэднім каля 1,3 мільёна рублёў на кожнага гаспадара...

А чым канкрэтна дапамагаюць на месцах вяскоўцам, якія маюць прыватныя гаспадаркі?

Наталля Драбовіч, старшыня Більдзюгскага сельскага Савета дэпутатаў Шаркаўшчынскага раёна, сама мае падсобную гаспадарку. І карову трымае. Паводле яе слоў, насельніцтва на тэрыторыі сельсавета — 1380 чалавек, а колькасць гаспадарак — каля 630. У грамадзян больш за 260 кароў, свіней пад 600, ёсць 15 коней...

— Але штогод усё менш гаспадарак застаецца: насельніцтва старэе. Многім ужо здароўе не дазваляе трымаць тую ж жывёлу, а моладзь не вельмі ахвотна заводзіць кароў, — расказвае старшыня. — Хаця ніякіх праблем са зборам малака няма — гэтым займаецца індывідуальны прадпрымальнік. Ён збірае малако 2 разы на дзень і разлічваецца своечасова. Бывае, людзі незадаволеныя тым, якую ім выстаўляюць тлустасць малака. Выязджаем на месца, разам разбіраемся.

Што датычыцца апрацоўкі зямельных участкаў, за грамадзянамі замацавана звыш 460 гектараў зямлі, у тым ліку больш за 210 га — палі агульнага севазвароту. На гэтых участках араць, сеяць, збіраць зерне, сушыць яго людзям не трэба, бо ўсё гэта робіцца цэнтралізавана энергонасычанай тэхнікай. І толькі 30 працэнтаў ад выдаткаў вяскоўцы аплачваюць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота БЕЛТА.

КАМПЕТЭНТНА

Святлана ГЕРАСІМОВІЧ:

«МЫ ГАТОВЫ ПАКАЗАЦЬ СВАЕ ЗДАБЫТКІ ЗАМЕЖНІКАМ»

Нядаўна старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Святлана Герасімовіч брала ўдзел у 24-й сесіі Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы (КМРУСЕ), што адбылася ў французскім Страсбургу.

Якія пытанні там абмяркоўваліся? Што з замежнага вопыту карыснае для нас? Наколькі цікавыя для іншых беларускія напрацоўкі ў сферы рэгіянальнай палітыкі і мясцовага самакіравання? Пра гэта сённяшняя гутарка з сенатарам.

— Для пачатку, Святлана Міхайлаўна, распавядзіце крыху пра сам Кангрэс мясцовых і рэгіянальных улад. Якія яго задачы, мэты? Наколькі гэтая арганізацыя ўплывовая?

— Кангрэс мясцовых і рэгіянальных улад — гэта кансультатыўны орган Савета Еўропы, які прадстаўляе мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады еўрапейскіх дзяржаў. Кангрэс спрыяе развіццю мясцовай дэмакратыі ў Еўропе, рыхтуючы справаздачы аб развіцці сітуацыі ў дзяржавах, якія з'яўляюцца яго членамі. Ён таксама ажыццяўляе назіранне за мясцовымі і рэгіянальнымі выбарамі і захаваннем еўрапейскіх стандартаў у гэтай галіне. Гэта орган, які складаецца з прадстаўнікоў, што маюць мандат членаў мясцовых і рэгіянальных органаў улады, назначаных у адпаведнасці з іх працэдурай. Як і Парламенцкая асамблея СЕ, Кангрэс налічвае 318 членаў і 318 іх намеснікаў, якія прадстаўляюць 47 дзяржаў — членаў Савета Еўропы.

— Як вядома, Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі мае ў арганізацыі статус назіральніка — а гэта выклікае пэўныя абмежаванні. Ці ўдаецца ў такім выпадку данесці да членаў Кангрэса меркаванні па тым ці іншым пытанні?

— Назіральнікі прымаюць удзел у рабоце Кангрэса і яго палат з правам на выступленне са згоды Старшыні, але без права ўдзельнічаць у галасаванні. Прадстаўнікі Савета па ўзаемадзеянні ўдзельнічаюць у пасяджэннях Бюро, Пастаяннага камітэта, статутных камітэтаў і спецыяльных рабочых груп.

Так, пэўныя абмежаванні ёсць. Але праз гэтую структуру мы ўзаемадзейнічаем з Саветам Еўропы. Мы распавядаем членам Кангрэса аб тым, чым рэальна жыве Беларусь, як працуюць органы мясцовага самакіравання і што робіцца для нашых людзей.

— У Страсбургу, зразумела, былі не толькі пасяджэнні, але і шматлікія сустрэчы. Якія пытанні вы абмяркоўвалі са старшынёй Палаты мясцовых улад Кангрэса Жанам-Клодам Фрэконам і старшынёй Палаты рэгіёнаў КМРУСЕ Наталляй Раманавай?

— Сустрэча са старшынёй Палаты мясцовых уладаў Кангрэса адбылася згодна з нашай папярэдняй дамоўленасцю. У ёй па сваёй ініцыятыве прыняла ўдзел і прадстаўнік Украіны Наталля Раманава. Жан-Клод Фрэкон казаў аб вялікай цікавасці Кангрэса да пабудовы сістэмы мясцовага самакіравання ў Беларусі. У сувязі з гэтым паўстала прапанова аб узаемным абмене — дэлегацыі КМРУСЕ ў Беларусь і беларускай дэлегацыі ў адну з краін — членаў Савета Еўропы. Гэта дазволіць прадстаўнікам Кангрэса на свае вочы ўбачыць, як у Беларусі развіваецца мясцовае самакіраванне і як мы выкарыстоўваем еўрапейскі вопыт. У нас сёння не сорамна паехаць у любы аграгарадок, у любы раён. І нам ёсць аб чым распавесці.

У сваю чаргу, Савету па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь будзе цікава і карысна азнаёміцца з вопытам работы органаў мясцовага самакіравання канкрэтнай еўрапейскай дзяржавы.

— А якія яшчэ краіны ўзгадвалі дакладчыкі на сесіі Кангрэса?

— На сесіі былі разгледжаны даклады аб функцыянаванні мясцовай і рэгіянальнай дэмакратыі ў Іспаніі, Грузіі і Італіі, мясцовых выбарах у Арменіі, Босніі і Герцагавіне. У прыватнасці, Іспанію крытыкавалі за фінансавую залежнасць мясцовых улад ад цэнтра і адсутнасць рэальнага прадстаўніцтва тэрытарыяльных улад у Сенаце. Даходы іспанскіх муніцыпалітэтаў у значнай частцы фарміруюцца з датацый дзяржавы (63,5%) і рэгіёнаў. Сенатары ў Іспаніі, згодна з Канстытуцыяй, выбіраюцца ў асноўным правінцыямі (208 з 266 месцаў у Сенаце). Аднак правінцыі на справе з'яўляюцца толькі тэрытарыяльнымі, а не адміністрацыйнымі ўтварэннямі, у іх адсутнічаюць уласныя органы улады.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ

СІТУАЦЫЯ З АПТЫМІЗАЦЫЯЙ

Ідэя аптымізацыі сельсаветаў жыхарамі Міншчыны ўспрымаецца неадназначна. Як сведчаць звароты ў «Мясцовае самакіраванне», людзей, у першую чаргу палохае, што разам з узбуйненнем давядзецца развітацца з сацыяльнай інфраструктурай. А пры адсутнасці аб'ектаў сацкультбыту вёска асуджана на выміранне.

З гэтай нагоды даслалі ў рэдакцыю ліст і жыхары Тучанскага сельсавета Клецкага раёна. «Мы просім не прыпыняць работу нашага сельскага Савета. На нашай тэрыторыі пражываюць 1474 чалавекі, у тым ліку 712 — працаздольнага ўзросту. Тут знаходзяцца 2 сельгасарганізацыі, 3 установы адукацыі, 7 гандлёвых пунктаў, прадпрыемства грамадскага харчавання, Дом культуры, 2 бібліятэкі, бібліятэка-клуб, 3 фельчарска-акушэрскія пункты, 2 паштовыя аддзяленні, — пералічваюць яны. — Мы пастаянна звяртаемся да мясцовай улады па розных пытаннях. І ніколі не сутыкаліся з абыякавасцю і непрафесійнасцю супрацоўнікаў».

Старшыня Клецкага раённага Савета дэпутатаў Святлана ЧАКУН тут цалкам згодна з меркаваннем аўтараў пісьма: кожны з яе падначаленых кампетэнтны ў сваёй справе. Разам з тым, па словах Святланы Уладзіміраўны, ніхто з работнікаў сельвыканкамаў не застанецца без работы.

— Мы зацікаўлены ў тым, каб людзі, якія маюць багаты вопыт дзяржаўнай службы, жывуць на гэтай зямлі, змаглі працаваць. Таму і прапануем ім месцы ў бліжэйшых сельвыканкамах. — Што датычыцца аптымізацыі сельсаветаў, то гэта аб'ектыўны працэс: колькасць насельніцтва на вёсцы змяншаецца. Напрыклад, за апошняе дзесяцігоддзе колькасць жыхароў Тучанскага сельсавета паменшылася на 938.

Сёння ў Клецкім раёне налічваецца 11 сельсаветаў, плануецца скасаваць два — Нагорнаўскі і Тучанскі. «Але мы зрабілі ўсё неабходнае, каб не пагоршыць становішча людзей. Па-першае, пры вывучэнні пытання ўлічвалі межы сельгасарганізацый, магчымасць прывязкі адміністрацыйных цэнтраў сельсаветаў да аграгарадкоў, а таксама колькасць насельніцтва, што пражывае на гэтай тэрыторыі. Адна частка Тучанскага сельсавета адыдзе да Кухчыцкага сельсавета. У выніку тут колькасць жыхароў павялічыцца да 2200. З узбуйненнем на тэрыторыі гэтага сельсавета будуць функцыянаваць дзве сельгасарганізацыі — адкрытае акцыянернае таварыства «Кухчыцы» і менш буйны сельскагаспадарчы вытворчы філіял «Туча» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінск-Крыштальскі». Другая частка, значна меншых памераў, далучаецца да самага аддаленага ад райцэнтра Галынкаўскага сельсавета.

На думку старшыні райсавета, рэарганізацыя праводзіцца прадумана, з улікам меркаванняў усіх бакоў. У тым ліку і дэпутатаў пярвічнага ўзроўню, якія далі згоду на змену адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання раёна. У пацвярджэнне сваіх слоў яна прыводзіць такі прыклад. Дзяржаўнае прадпрыемства «Племянны завод «Чырвоная зорка» размешчаны на тэрыторыі трох сельсаветаў. Цяпер жа гаспадарка будзе знаходзіцца ў межах аднаго — Чырваназоркаўскага, а кіраўнік прадпрыемства будзе трымаць сувязь з адным старшынёй сельвыканкама і вырашаць пытанні адной тэрыторыі.

— Уявіце, яму трэба было ўдзельнічаць у сесіях трох выканкамаў, сустракацца з кожным старшынёй, зачастую ва ўрон сваёй службовай дзейнасці, — канстатуе Святлана Чакун.

— Хваляванні жыхароў можна зразумець: людзі прывыклі, што мясцовая ўлада знаходзілася побач, у крокавай даступнасці. Але аптымізацыя тэрыторый сельсаветаў прадыктавана жыццём, — упэўнены **старшыня Клецкага райвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ**. — За апошнія 27 гадоў насельніцтва раёна зменшылася на 20 тысяч. Ды і мы імкнёмся ні ў якім разе не пагоршыць становішча людзей, даць нармальна функцыянаваць прадпрыемствам. Што датычыцца транспартных зносін, то мяркуецца наладзіць дадатковы аўтобусны маршрут Клецк —Туча праз Кухчыцы падчас абеду.

Як запэўніў Генадзь Міхайлавіч, ліквідацыя сельсавета не пацягне за сабой закрыццё сацыяльна значных аб'ектаў аграгарадка Туча. У звычайным рэжыме будуць працаваць комплексны прыёмны пункт, школа, дзіцячы садок, Дом культуры, ФАП, магазіны. Аддзяленне паштовай сувязі таксама ніхто не збіраецца ліквідаваць, паколькі яно рэнтабельнае. Для больш аператыўнага рашэння пытанняў жыццезабеспячэння грамадзян плануецца арганізаваць работу спецыяліста Кухчыцкага сельвыканкама ў аграгарадку Туча раз ці два разы на тыдзень. Ён будзе выдаваць даведкі, весці справаводства. Неабходныя дакументы можна заказаць і па тэлефоне.

> **Ліквідацыя сельсавета не пацягне за сабой закрыццё сацыяльна значных аб'ектаў аграгарадка.**

Вызваленыя будынкі сельвыканкамаў таксама не будуць пуставаць, упэўнены раённыя ўлады. Пытанне па іх выкарыстанні пакуль аналізуецца, вывучаецца. Напрыклад, на памяшканне Тучанскага сельвыканкама ёсць ахвотныя. Яно стаіць на трасе рэспубліканскага значэння Слуцк—Івацэвічы. Даволі зручнае месца для арганізацыі прыдарожнага сэрвісу. Праўда, будынак Нагорнаўскага сельвыканкама аддалены ад бойкіх дарог. Але ў гэтым ёсць і свае перавагі: знаходзіцца на беразе маляўнічага возера — добры куток для адкрыцця аграсядзібы, арганізацыі турызму.

Сёння на Міншчыне налічваецца 288 сельсаветаў. Паводле папярэдніх разлікаў, іх застанецца 200—210. «Сельсавет можа нармальна функцыянаваць, калі на яго тэрыторыі пражывае 2—4 тысячы чалавек. У вобласці ж ёсць сельсаветы, дзе пражывае і тысяча, і больш за пяць тысяч чалавек», — так пракаментаваў сітуацыю з аптымізацыяй **губернатар Мінскай вобласці Барыс БАТУРА**, адказваючы на пытанне нашага карэспандэнта. Па яго словах, аб'яднанне сельсаветаў не паўплывае на зручнасць пражывання насельніцтва. Калі адміністрацыя будзе знаходзіцца далёка ад населенага пункта, то давядзецца арганізаваць разнастайныя формы работы з насельніцтвам па месцы жыхарства. Разам з тым, губернатар адзначыў, што рашэнні па ўзбуйненні сельсаветаў будуць прымацца разважліва і асцярожна, з улікам меркавання як жыхароў, так і мясцовай улады.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Клецкі раён.

ДОКШЫЦЫ ЗАПРАШАЮЦЬ У ЕЎРАРЭГІЁН

Докшыцкі раён запрасілі ўвайсці ў склад еўрарэгіёна «Азёрны край», у які з беларускага боку ўжо ўваходзяць Верхнядзвінскі, Мёрскі, Пастаўскі, Браслаўскі, Глыбоцкі, а таксама Полацкі раёны. Названы еўрарэгіён стварылі восенню 1998 года — ён спрыяе супрацоўніцтву прыгранічных раёнаў Беларусі, Латвіі і Літвы.

Перспектывы ўваходжання Докшыцкага раёна ў «Азёрны край» і іншыя пытанні супрацоўніцтва абмяркоўваліся падчас знаходжання ў раённым цэнтры афіцыйнай дэлегацыі муніцыпалітэта горада Балві з Латвіі. Летась паміж Докшыцамі і горадам Балві быў падпісаны дагавор аб узаемадзеянні. І вось цяпер прыйшоў час рэалізацыі канкрэтных праектаў.

Як расказалі ў Докшыцкім райвыканкаме, Андрыяс Казіноўскіс, старшыня думы муніцыпалітэта латвійскага горада, падкрэсліў, што ўлады горада Балві гатовы прапанаваць Докшыцкаму раёну ўзаемавыгадныя праекты супрацоўніцтва ў розных галінах, у тым ліку і ў сферы турызму і бізнесу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НА ДАПАМОГУ СПАДЗЯВАЙСЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Спецыялізаваная тэхніка прачышчае зарослыя каналы.

У двары Мікалая Паўлавіча з'явіўся невялікі вадаём.

Заходзім у хату, дзе толькі-толькі адпампавалі ваду. Не дзіва, што гаспадыня «плавала» ў хаце — фундаменту няма, вокны амаль наравне з зямлёю. А па суседстве — гаспадарка Мікалая Паўлавіча, які вырашыў выкарыстаць свой штогадовы патоп сабе на карысць. Каля дома з'явіўся невялікі вадаём, у які гаспадар збіраецца і рыб запусціць.

Зараз у мікрараёне Максімаўка будуецца чарговая дамба, спецыялізаваная тэхніка прачышчае зарослыя каналы. У наступным годзе барысаўчан не будуць турбаваць рэкі, а пазбегчы паводкі дапамогуць уласная ўважліваць і працавітасць.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ДАЛІКАТНАЯ ТЭМА

ПАХАВАННЕ АДЗІНОТЫ

Падаецца, што тэма гэтая не проста далікатная, але і не самая тыповая для абмеркавання. Усім, зразумела, выпадае браць удзел у пахаваннях, але, як кажуць, «жывым — жывое».

Тым не менш, прадстаўнікам мясцовай улады ў сельскай мясцовасці часта даводзіцца адкідваць такія «сантыменты», каб дапамагчы людзям: адным — знайсці вечны спакой на вясковых могілках, іншым — аддаць даніну памяці суседзям і сябрам. У Сідаравіцкім сельсавеце Магілёўскага раёна расказалі, як арганізоўваюць провады ў «вечны шлях» для адзінокіх вяскоўцаў.

Старшыня Сідаравіцкага сельскага Савета Алена ПШАНІЧНАЯ кажа, што арганізацыя пахавання — сама па сабе не праблема. На тэрыторыі сельсавета знаходзяцца 8 вёсак, і ў шасці з іх ёсць свае могілкі, за парадкам на якіх сочаць улады і самі людзі.

Ад аграгарадка Сідаравічы да Магілёва — 25 кіламетраў, і, у адрозненне ад прыгарадных могілак, на месцы для пахавання тут няма вялікага попыту.

— Даўно пайшлі тыя часіны, калі людзі прасілі суседзяў выкапаць магілу і дапамагчы ў іншых пахавальных справах, — расказвае Алена Валер'еўна. — Усе карыстаюцца паслугамі рытуальных службаў з Магілёва, якія прадстаўляюць паслугі нядорага і, як правіла, на ўзроўні. Спецыялісты ў рытуальнай справе робяць усё і прывозяць усё — ад свечкі да труны.

Непасрэдна ж кіраўніцтва сельсавета ўсё гэта датычыцца, калі памірае чалавек адзінокі.

— Мне падаецца, што іншага выйсця і няма: трэба зрабіць усё цывілізавана, — кажа Алена Пшанічная.

Усё пачалося з састарэлага мужчыны, які памёр у Сухараўскай сельскай бальніцы.

— Гэты мужчына калісьці прыехаў з Украіны і набыў хату ў вёсцы Слабодка, — узгадвае старшыня Савета. — У яго былі не вельмі добрыя сямейныя абставіны: ён разышоўся з жонкай, з сынам не падтрымліваў зносіны. Адзінокаму чалавеку мы дапамагалі з дровамі і іншымі надзённымі праблемамі. Калі надышоў час, ён папрасіў у нас падтрымкі, каб атрымаць сацыяльнае месца ў бальніцы. Яно і стала яго апошнім прытулкам. А потым нам патэлефанавалі і спыталіся, як хаваць. Вядома, ёсць такія месцы на могілках, дзе хаваюць «пад таблічкай». Шчыра кажучы, гэта робіць на мяне страшнае ўражанне. Гэта і прымусіла першым разам задумацца, як арганізаваць пахаванне адзінокага вяскоўца.

Паводле закона, грашовую дапамогу на пахаванне мае права атрымаць не толькі сваяк, а кожны, хто непасрэдна арганізоўвае пахаванне. Так што сельвыканкам і яго старшыня сталі на чале гэтай сумнай працэдуры. Тэлефон арганізацыі ў Магілёве, якая аказвае рытуальныя паслугі, знайшлі ў газеце.

— Аказалася, што людзі, якія прыехалі, сапраўды могуць зрабіць усё, што трэба, — расказвае далей Алена Валер'еўна. — Так што наша супрацоўніцтва працягваецца: пачынаючы з таго выпадку ў 2006 годзе, прыкладна раз на год нам даводзіцца браць на сябе арганізацыю пахавання для вяскоўца, пра якога няма каму паклапаціцца. У той першы раз старэнькія бабулі-суседкі падзякавалі нам, што мы пахавалі нябожчыка належным чынам, і гэта кампенсавала ўсе нашы клопаты.

Паводле статыстыкі, сёння на тэрыторыі Сідаравіцкага сельсавета налічваецца 37 абсалютна адзінокіх жыхароў, якія не маюць дзяцей ці іншых блізкіх сваякоў. Ёсць таксама вяскоўцы, якія жывуць адзінока, але да іх прыязджаюць з горада і іншых мясцін дзеці: такіх на гэты момант 258. Але ў некаторых дзеці далёка, у іншых краінах. Увогуле ў сельсавеце жыве больш за 1600 чалавек, з якіх амаль дзве сотні — старэйшыя за 80 гадоў.

Часта для таго, каб пахаваць чалавека, трэба тэрмінова знайсці яго сваякоў. Алена Пшанічная прызнаецца, што гэта не заўсёды ўдзячная (калі можна скарыстацца такім словам) справа. Навіна аб смерці непрыемная, і сваякоў часам даводзіцца ўгаворваць прыехаць і ўзяць на сябе клопаты па арганізацыі пахавання.

— Многія адразу пытаюцца пра грошы, — кажа старшыня сельскага Савета. — Тым не менш грошай, якія сёння выдаткоўвае дзяржава на пахаванне чалавека, хапае на ўсё, але ўпрытык, і прыбытку, прабачце, на гэтым не атрымаеш дакладна. Калі мы арганізоўваем пахаванне, то сціплыя рэшткі грашовай дапамогі звычайна ідуць на тое, каб сімвалічна пачаставаць суседзяў і сяброў нябожчыка на традыцыйным памінанні.

Алена Валер'еўна таксама адзначыла, што з адкрыццём праваслаўнага храма ў пасёлку Усход Магілёўскага раёна ім дапамагае і настаяцель айцец Анатоль. Ён спагадлівы чалавек, расказваюць у сельсавеце, і не толькі робіць усё належным чынам, але і выказвае спачуванне сваякам і сябрам нябожчыка, што таксама для іх важна: не «штампоўка», а стаўленне з душой.

Яшчэ адна добрая памочніца кіраўніка сельсавета — **старараста аграгарадка Сідаравічы Алена Уладзіміраўна ШАРШНЁВА**. Яна працуе сацыяльным работнікам і якраз даглядае адзінокіх нямоглых людзей. Староста — чалавек актыўны і вопытны, таму яе дапамогу вельмі цэняць старшыня.

— Калі сустракаюся з калегамі на вучобе ў сталіцы, бачу, што не ўсе старшыні сельскіх Саветаў разумеюць нашы клопаты па пахаванні адзінокіх людзей, — прызнаецца Алена Пшанічная. — Жанчыны пагаджаюцца, што гэта добрая справа, а вось мужчыны звычайна пытаюцца, навошта нам гэта трэба. Мне гэта трэба, каб адчуваць сябе нармальным чалавекам.

Старшыня Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў Валянцін САЛАВЕЙ сказаў, што пахаваннем адзінокіх людзей займаюцца і іншыя сельсаветы раёна. Так, дарэчы, рабіў і ён сам, калі ўзначальваў Буйніцкі сельсавет.

— Грошы выдаткоўвае на пахаванне дзяржава, таму тут ад мясцовай улады патрабуюцца толькі час і сілы, — сказаў Валянцін Адамавіч. — Гэта, вядома, нідзе не прапісана ў абавязках старшынь — яны добраахвотна бяруць на сябе такі клопат. А што ж рабіць? Трэба па-чалавечы ставіцца да людзей, і ў такой справе таксама.

Ілона ІВАНОВА.

«МЫ ГАТОВЫ ПАКАЗАЦЬ СВАЕ ЗДАБЫТКІ...»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У выніку сенатары выбіраюцца непасрэдна жыхарамі правінцый, а не мясцовымі заканадаўчымі сходамі, як, напрыклад, у Беларусі. Такім чынам, выбары ў Сенат у рэальнасці праводзяцца тымі ж палітычнымі партыямі, якія прадстаўлены ў ніжняй палаце, а не мясцовымі ўладамі. Адрозненне паміж верхняй і ніжняй палатамі Парламента практычна губляецца. У сувязі з гэтым вопыт непрамога абрання членаў Савета Рэспублікі на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню вобласці, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета прадстаўляецца больш перадавым, ён цалкам адпавядае палажэнням Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання.

— А што яшчэ з беларускага вопыту ў развіцці мясцовага самакіравання магло б зацікавіць іншыя краіны?

— Асаблівасцю беларускай мадэлі мясцовага самакіравання з'яўляецца разгорнутая сетка мясцовых Саветаў дэпутатаў, актыўны ўдзел дэпутатаў у вырашэнні праблем мясцовага ўзроўню. Акрамя таго, пытанні ўзаемадзеяння мясцовых Саветаў у нашай краіне каардынуюцца Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. Задача, якая вырашана пры дапамозе стварэння такой структуры, — гэта забеспячэнне каардынацыі паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, органамі мясцовага самакіравання і органамі дзяржаўнага кіравання з мэтай дасягнення канкрэтных вынікаў шляхам вывучэння актуальных праблем «глыбінкі», іх аналізу і абагульнення. Саветы атрымалі рэальную магчымасць абмяркоўваць свае праблемы, выносіць іх на дзяржаўны ўзровень, абменьвацца меркаваннямі. Гэтыя аспекты, мяркую, былі б цікавымі для іншых краін. І мы, паўтаруся, гатовы да таго, каб паказаць свае здабыткі замежным дэлегацыям. Як і выслухаць канструктыўныя прапановы.

— Святлана Міхайлаўна, а ці мяняецца ў Еўропе стаўленне да нашай краіны? Ці ёсць жаданне больш глыбока вывучыць працэсы, што тут адбываюцца?

— У апошні час ёсць увага да Беларусі. Адчуваецца, што ўсё больш людзей з павагай да нас ставяцца. Паважаюць нашу самастойнасць, парадак, тое, што заводы працуюць. Дарэчы, і апошняе пасяджэнне Кангрэса было крыху іншым. Старшыня Хервіг ван Стаа ва ўступным слове гаварыў пра тое, што ў складзе Кангрэса няма Беларусі. Што гэта краіна асаблівая, што ў яе адметнае геаграфічнае становішча і трэба лічыцца з гэтым. Такія перамены — гэта вынік намаганняў і кіраўніцтва нашай краіны, і замежных сяброў Беларусі. Так, у рамках дэбатаў па тэме «Расія — Савет Еўропы: будаўніцтва еўрапейскай дэмакратыі» было заслухана выступленне Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу РФ Валянціны Мацвіенкі, якая адзначыла, што няма краіны — эталона, не павінна быць зносін «настаўнік — вучань» паміж краінамі. Пра неабходнасць іншага стаўлення да нашай краіны гаварыў і мой калега, старшыня Камісіі Савета Федэрацыі Сцяпан Кірычук. З расійскімі і ўкраінскімі ўдзельнікамі, мы, да слова, намецілі шэраг праектаў па паглыбленні супрацоўніцтва.

Цяпер у Еўропе ўсё часцей кажуць, што трэба ісці насустрач, пазнаваць Беларусь. Прыходзіць разуменне аб непрадукцыйнасці канфрантацыі. І гэта вельмі важна.

Гутарку вяла Вера КОТАВА.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

НОВЫ ПОГЛЯД НА «ХВАРОБЫ» ПАЛІКЛІНІК

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Напрыклад, спецыялісты абласной клінічнай бальніцы ўжо праводзяць тэлекансультацыі з калегамі ў раёнах, дапамагаючы ім у лячэнні. Дык хіба ж гэта звышскладаная праблема — наладзіць у гродзенскіх паліклініках запіс на прыём да доктара праз інтэрнэт? Гэта ж ужо зусім не навацыя для Беларусі.

І вось паліклінікі атрымліваюць статус юрыдычных асоб. Чаго чакаць цяпер і як успрынялі гэта самі кіраўнікі паліклінік?

— Павышаецца адказнасць кожнай медустановы за вынік сваёй працы. І ў той жа час у іх з'яўляюцца магчымасці распараджэння фінансавымі рэсурсамі, уласнай кадравай палітыкі. Мажліва, некаторыя кіраўнікі, якія не прызвычаіліся браць адказнасць на сябе, пакуль з апаскай успрымаюць гэтыя змены. Аднак у кожнага будзе шанц праявіць сябе. А чаму трэба навучыць — навучым, — кажа Наталля Антановіч.

Дарэчы, неўзабаве пасля прыезду ў горад над Нёманам **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА** сустрэўся з кіраўнікамі медыцынскіх устаноў абласнога цэнтра. Пацікавіўся, якія там праблемы, чым дапамагчы. Многія тады сядзелі моўчкі, быццам ніякіх цяжкасцяў не існуе. Аднак не ўсе. **Загадчыца 1-й дзіцячай паліклінікі Ірына ЛУКАНСКАЯ** папрасіла дапамогі ва ўцяпленні будынка гэтай медустановы. І што ж атрымалася?

Ірына Эдуардаўна расказвае, што праблема цеплавой рэабілітацыі паліклінікі на той час хвалявала больш за ўсё. Сцены былі з тонкіх пліт, напаўгнілыя вокны, амаль за 30 гадоў будынак ні разу капітальна не рамантаваўся. Дзецям немагчыма было рабіць масаж, водныя і фізіяпрацэдуры з-за элементарнай халадэчы. Што, зразумела, перашкаджала рабоце, і асабліва першага ў вобласці кабінета ранняй рэабілітацыі дзяцей з месячнага ўзросту, у якіх ёсць розныя праблемы са здароўем. У выніку вобласць і горад выдзелілі грошы, была зроблена цеплавая рэабілітацыя будынка з заменай вокнаў.

А вось дзіцячая пляцоўка, што знаходзіцца на тэрыторыі паліклінікі, зроблена сіламі саміх медработнікаў. Яны ж паклапаціліся і аб упрыгажэнні сцен установы — нават не верыцца, што гэтыя творы належаць не пэндзлю прафесійных мастакоў.

Летась у паліклініцы пры падтрымцы абласнога ўпраўлення аховы здароўя адкрылі цудоўны кабінет спелеатэрапіі — накшталт салявой пячоры, дзе атрымліваюць курс лячэння дзеці з алергічнымі захворваннямі органаў дыхання. Прычым няма абмежаванняў па ўзросце — у гэтай пячоры лечацца нават самыя маленькія, ды яшчэ і пад музыку.

Зрэшты, хапае і праблем. У прыватнасці, Ірыне Луканскай, педыятру з вялікім стажам, вельмі крыўдна, што ў аддзяленні паліклінікі па вуліцы Урублеўскага малых і сёння ўзважваюць на металічных вагах. Куды гэта варта? Ёсць жа электронныя вагі — прыгожыя, зручныя.

На парадку дня таксама перааснашчэнне афтальмолагаў, лор-службы. Калі вопытны доктар, паглядзеўшы дзіцяці вочнае дно на старым абсталяванні, убачыць там захворванне, то гэта сведчыць аб яго высокім прафесіяналізме. Аднак, акрамя гэтага, у свеце існуюць і пэўныя методыкі. Напрыклад, у распараджэнні педыятраў у Брэсце ўжо ёсць апарат ультрагуку вока.

А хіба нармальна, што лор-урач, як калісьці яго земскі калега, мае толькі лямпачку і лобны рэфлектар? У яго павінен быць эндаскоп, каб мець магчымасць не толькі праз варонку глядзець у вуха і нос дзіцяці.

— Упэўнена, што, стаўшы самастойнымі, мы зможам рацыянальна распарадзіцца грашыма бюджэту і тым, што зарабляем на платных паслугах. Гэтыя сродкі накіруем найперш на развіццё, удасканаленне нашай матэрыяльна-тэхнічнай базы, на новае абсталяванне, вучобу персаналу. І, думаю, мясцовая ўлада нас падтрымае, — адзначае Ірына Луканская.

Сапраўды, як не падтрымаць калектыў, які настроены на вынік, і ўстанову, супрацоўнікі якой летась ўкаранілі 81 інавацыйную методыку, 4 з якіх былі прызнаны рацпрапановамі?

УНН 600024712

Вниманию акционеров

ОАО «Белгорхимпром»!

ПОВТОРНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ 7 мая 2013 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2012 год и основных направлениях деятельности в 2013 году.

2. Отчет ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2012 год.

3. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2012 году.

4. Утверждение распределения прибыли и выплаты дивидендов за 2012 год.

5. Утверждение распределения прибыли и выплата дивидендов на 2013 год.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30.

ПРЫВАТНАЕ — ЧАСТКА АГУЛЬНАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Як адзначыла старшыня, вялікіх праблем з падсобнымі гаспадаркамі няма і быць не можа, бо нюансы дапамогі напрацаваны за доўгія гады. Вядома, бываюць незадаволеныя тым, што іх участак апрацавалі трохі пазней. Але ж немагчыма адразу дабрацца з тэхнікай да ўсіх участкаў у аддаленыя вёскі.

А вось у Лёзненскім раёне ў цэнтры ўвагі зараз дапамога ў набыцці свіней. **Старшыня Лёзненскага сельскага Савета Святлана ПУКАВА** адзначыла, што нават на сваёй службовай машыне сама прывозіць вяскоўцаў да месца пакупкі свінак.

— У нас на 3480 чалавек насельніцтва прыходзіцца больш за 1,5 тысячы прыватных гаспадарак. Зараз аказваем дапамогу ў пакупцы парасят, арганізуем падвоз на комплекс. Ёсць дагавор і з птушкафабрыкай — у пачатку мая падаецца заяўка на пакупку куранят, вызначаецца зручны час для падвозу і набыцця птушанят, — гаворыць Святлана Уладзіміраўна.

Сёння гаспадары трымаюць каля 150 кароў. 56 расцяліліся, 33 цяляці купілі сельгаспрадпрыемствы. Апошнія па-рознаму ацэньваюць паслугі па вырошчванні цялят. У гаспадарцы «Выдрэя» ў асноўным купляюць цёлак і прапануюць па 35 тысяч рублёў за кіло жывой вагі плюс 1 кілаграм збожжа на кожнае кіло цяляці. У іншай гаспадарцы — «Адаменкі» — даюць 22 тысячы рублёў за кіло, плюс сена і бульбу для кармлення. Таму ёсць у людзей варыянты — куды здаць цялят. Малако збіраюць два прадпрымальнікі: тэрыторыя вялікая, як і аб'езд.

Каб на месцы высветліць, якія ў гаспадароў прыватных гаспадарак назапасіліся пытанні, праводзяцца сустрэчы з насельніцтвам у вёсках— кожную сераду. У такіх «сходах» бяруць удзел кіраўнікі гаспадарак, якія і распавядаюць пра паслугі насельніцтву ў апрацоўцы агародаў, нарыхтоўцы сена, зборы ўраджаю. У сустрэчах бяруць удзел кіраўнікі і адказныя супрацоўнікі райвыканкама і райсавета.

Як канстатавала старшыня, пакуль не ўсе разумеюць выгоды палёў агульнага севазвароту. Маўляў, а раптам ураджаю не будзе? Таму і сёння многія вяскоўцы зерневыя культуры самі на сваіх участках вырошчваюць. Пры гэтым і ім аказваецца дапамога тэхнікай у апрацоўцы, сяўбе, зборы ўраджаю.

Асаблівасць Акцябрскага сельсавета ў тым, што ён знаходзіцца пад бокам абласнога цэнтра.

— На тэрыторыі нашага сельсавета два аграгарадкі — Акцябрскі і Копці. Там людзі жывуць у кватэрах, а не ў прыватных дамах. Лічыце, што яны — гарадскія, але добра, што не страцілі жадання мець гаспадарку — у асноўным гэта жыхары пенсійнага ўзросту. Не адмаўляем, выдзяляем участкі, — расказвае **Вячаслаў ГРЫБАНАЎ, старшыня Акцябрскага сельскага Савета Віцебскага раёна.** — Тым, у каго ёсць буйная рагатая жывёла, выдзяляем пашы. Дапамагаем вяскоўцам у набыцці насення, арганічных угнаенняў. Апошніх тут шмат дзякуючы свінаводчаму комплексу і малочнатаварнай ферме.

На тэрыторыі сельсавета засталося каля 50 галоў буйной рагатай жывёлы — няшмат. Малако ў людзей збірае адкрытае акцыянернае таварыства з аднайменнай назвай «Малако». Частку малака гаспадары вязуць на продаж самі і збываюць без праблем.

Извещение о проведении 17 мая 2013 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Сведения о земельном участке	Местонахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов без НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
«Цех по выпуску товаров народного потребления с бытовыми помещениями и столовой» общей площадью 12649,8 кв.м, инвентарный номер (кадастр.) 500/U-55797 (незавершенное законсервированное капитальное строение)	Площадь – 0,5518 га, кадастровый номер 500000000002006908	г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 16	22 080 000 000	1 500 000 000

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Торги проводятся **17 мая 2013 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **25.04.2013 по 15.05.2013 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327 48 36 – (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017) 217 21 03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 25.007. Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2013 года.

■ Простыя рэчы Сяргея РУБЛЕЎСКАГА

КАВЕНЬКА

Калі вы, «зялёныя», дажывяце да майго ўзросту, дык міжволі звернеце ўвагу на тое, што горад поўны людзьмі з кавенькамі. Старасць сунецца па жыцці кульгаючы і лёгка абагульняецца праз сваю немач.

Хто, калі і як прыдумаў стандартную кавеньку, цяжка сказаць. Але атрымалася ўдала. Здаецца, яе нельга зрабіць больш простай і зручнай. Трывалая аснова з трубкі, зробленай з лёгенькага металу, зручная рукаяць з удала разлічанымі выгінамі — рука сашчэпліваецца з ёй нязмушана і надзейна, не раўнуючы як касмічны карабель з арбітальнай станцыяй. Атрымліваецца адно цэлае, хоць і з матэрыялаў рознай прыроды. Прасоўванне па зямной арбіце працягваецца!

Гэтае прасоўванне было б не такім трывалым і ўстойлівым, каб не адмысловы наканечнік кавенькі, адліты з асабліва непадатнай зносу, як шыны легкавікоў, гумы. Кавенька ў выніку не шкрабе, нібы капцюр, намошчаны тратуар, а «ступае» на

Чэрчыль з кавенькай.

яго мякка, як чаравік на тоўстай падэшве. І на ранішнім лядку гума не саслізгвае ўбок — «прыліпае».

Праўда, па падлозе грукоча, хоць і даволі глуха, але абуджальна. Прынамсі, я нават сярод ночы заўсёды прачынаюся, калі матуля па якой сваёй патрэбе ідзе па кватэры. Кавенька, здаецца, наўпрост грукае ў маё сэрца.

Неадбалансаванасць кавенькі па цэнтры цяжару трохі ўскладняе старым людзям карыстанне ёю. Кіёчак з рукаяццю трэба добра прымасціць, калі адстаўляеш яго ўбок на якую хвілінку, інакш круць — і зручнае апірышча, нарабіўшы грукату, ляціць долу. Гэты грукат трывожыць душу. «Ляці!..» — раптам чуеш трохі раздражнёны голас маці — і тут жа супакойваешся.

А пытанне «Сынок, ты не бачыў маёй кавенькі?» дык і наогул усцешвае. Ага, забылася на сваю спадарожніцу, прытуліўшы яе дзе-небудзь на кухні ці на балконе, прачыкільгала ў свой пакойчык без падпоркі. Абышлася. Значыць, ногі, дзякаваць Богу, яшчэ трымаюць.

Тут я трохі пашкадую, што ў нашай мове няма яскрава пераканаўчага адпаведніка рускаму слову «трость», які б падаваў гэтую рэч не толькі як атрыбут старасці, але і як красамоўны знак форсу, фасоністасці і панскай пыхі.

«Трость» пасуе і маладым, захінутым у адмысловыя строі крамяным здаравякам, а не толькі асунутым старасцю людзям. Гэтая адмыслова адштукаваная, са скульптурным навершшам рэч лёгка спалучаецца і са смокінгам, і са шчыблетамі з кракадзілавай скуры, і з тонкім шалікам на шыі ды і самой доўгай шыяй з графічна вытанчаным на ёй адамавым яблычкам...

А кавенька Чарлі Чапліна была выштукавана зусім не дзеля красы. Здаецца, яна адмыслова для яго вырасла з зямлі кароценькімі бамбукавымі каленцамі ды загнулася ў крук. А можна сказаць, і не з зямлі, а з усяго зямнога шара. Кавенька вусаценькага Чарлі вытачылася з раслінната свету не дзеля суцяшэння старасці, а каб таксама, як чапляюцца сучкі за калашыну ці падол, чапляцца за смешнае ў людскім гармідары.

Зусім інакшая, падараная каралём Эдуардам VII, кавенька была ва Уінстана Леанарда Спенсэра-Чэрчыля — з залатым кулачковым навершшам, з адмысловай гравіроўкай... Чэрчыль карыстаўся ёю ўсё жыццё. Кавеньку ён атрымаў у падарунак, калі быў самым маладым міністрам ва ўрадзе. І, вядома, не для таго, каб ён усцешыўся, што займеў надзейную падпорку маючай калі-нікалі адбыцца старасці. Грузна абапёршыся на кавеньку, усемагутны прэм'ер-міністр павінен быў пазначыць пуп зямлі, знакава ўціскаючы ў адвольна вызначаным месцы яе пругкае ўлонне.

Цяпер у самым цэнтры Лондана, у Парламенцкім скверы, на славутую кавеньку абапіраецца бронзавы Чэрчыль. Няўжо тут і праўда, як многім здаецца, пуп зямлі?..

Адзін знаёмы скульптар сказаў мне, што і Заір Азгур спачатку вылепіў Якуба Коласа з кавенькай у руцэ, а потым па невядомых прычынах прыбраў яе. Па ўсім відаць, так і было, бо правая рука ў скульптурным вобразе дзядзькі Якуба выглядае даволі ненатуральна — хоць ты падстаў пад яе звыклае апірышча. Вось так і жыве Беларусь без не пазначанага Коласавай кавенькай літаратурнага пупа.

Калі працягваць расповед пра знакамітых карыстальнікаў кавенькай, дык нельга не згадаць і нашага летуценнага вандроўніка Язэпа Драздовіча. Карунка-ва выразаная з атожылкавай сукавіны кавенька была ў яго відушчай. Язэп не абапіраўся на яе, а падаваў сваю руку — вядзі і помнымі сцяжынамі беларускай

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Колас... без яе.

мінуўшчыны, і праз далягляднyя абсягі ўяўленай будучыні.

Дзіўная рэч: кавенькі робяць людзей падобнымі адно да аднаго, можна сказаць, уніфікуюць іх, як дакументы часу. І стары дзед з маёй вёскі, і англійскі лорд, напрыклад, аднолькава паспяхова прыстасавалі кавеньку да сваіх зусім не звязаных з абапіраннем падчас хадзьбы патрэб. Дзедухна тупае вузкай сцежкай і, перамяняючы нагу, то падгоніць сваім кіёчкам-кавенькай бадлівую казачку, то, злёгку пастукваючы яе па скабах, скіруе ненаедную ў напрамку сваёй сядзібы...

Падцяты, як хорт, лорд, гуляючы кавенькай, няспешна шпацыруе па лонданскай брукаванцы, а як толькі па яго цыліндры забарабаняць першыя кроплі дажджу, тут жа ўскідвае яе ўгору і звыклым націсканнем кнопкі ператварае ў парасон...

Але кавенька-кіёчак, выразаная з хмыза простым сцізорыкам, мае пераканаўчую перавагу над лордаўскай «тростью». «Трость» так і застанецца моднай забаўкай у далікатных, дагледжаных руках, дарма што яе навершша ўладальнік-хвалько ўпрыгожыць цэлай жменяй дыяментаў. А кавенька-кіёчак у змазоленай, спрацаванай руцэ ці ў руцэ, з якой час ужо сцёр сляды адвечных простых клопатаў, на сцяжыне пошукаў і спадзяванняў незаўважна можа ўзвысіцца-вырасці да высокага посаха. І тады яго навершша ўпрыгожыць сонца існага.

Праўда, я зусім не шкадую, што ніводная кавенька-кіёчак, якіх так шмат мая матуля панаставіла каля роднай хаты, каб заўсёды той ці іншы быў пад рукой, ніколі не набудзе посахавай вышыні. Але што можа быць вышэй, чым глыбіня мацярынскага сэрца?

■

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 28 мая 2013 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение земельного участка (назначение в соответствии с единой классификацией)	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Симонова, в районе смотровой площадки УГАИ УВД Могоблисполкома (ограничения – водоохранная зона о. Святое)	0,0024	2 года	установка и обслуживание павильона (№ 1) по оказанию страховых услуг (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	740100000005004810	5 159 228	572 400	109 000
№ 2	улица Заречная, в районе жилого дома № 49 (ограничения – водоохранная зона р. Днепр, водопровод)	0,0056	2 года	установка и обслуживание торгового павильона (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	740100000005004809	6 636 880	882 400	168 000
№ 3	улица Б.Бирули, в районе остановки «Дом ветеранов» (в центр) (ограничения – газопровод, канализация)	0,0041	3 года	установка и обслуживание торгового павильона по продаже печатных изданий и розничной торговли (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	740100000001006542	5 861 621	1 330 100	253 000
№ 4	микрорайон жилой застройки «Спутник» по улице А. Пысина	0,3600	50 лет	строительство и обслуживание торгового центра с площадкой для сезонной торговли № 54 по генплану (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	740100000001006543	7 139 088	702 973 000	133 565 000

Принимать участие в аукционе имеют право граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающими принять участие в аукционе представляются **паспорт**, а также следующие документы:

Документ, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков)** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж), **с отметкой банка**.

Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя; **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность.

Представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких земельных участков**, вносят **задатки** в размере, установленном **для каждого из предметов аукциона**.

